Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ КП(б)Б БЕЛАРУСІ, РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ
САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ЧАЦЬВЕР
30 ліпеня 1931 г.
№ 173 (3262)

Алма-Ата, Ленина 81
Гос.Публичная Библиотека
февр-31г.-янв-32г. /С.Б.I./

Супроць інтэрвэнцыі—у абарону СССР

Увесь буржуазны друк каліталістычных краін узьняў дзікі лямант у сувязі з актыўнай падрыхтоўкай рэвалюцыйнага лягеру да дня 1-га жніўня. У гэты дзень пралетарыят і працоўныя масы ўсяго сьвету будуць дэманстраваць сваю непахісную волю, змагацца супроць імпэрыялістычных войн, будуць дэманстраваць сваю гатоўнасьць у кожную хвіліну стаць у абарону СССР—сваёй бацькаўшчыны. Буржуазія і яе лёкаі—сацыял-фашысты прыкладаюць усе сілы, ужываюць усе сродкі для таго, каб не дапусьціць, каб сарваць рэвалюцыйны баявы паход працоўных мас. Паліцэйскі тэрор, хлусьня, масавыя арышты—ўсё пушчана ў ход з тым, каб сарваць дэманстрацыю супроць войн, супроць інтэрвэнцыі.

У чым справа? Самі-ж буржуазныя палітыкі і асабліва сацыял-фашысцкія праваты расьпінаюцца, заліваюцца слёзамі «пацыфісцкімі фразамі», што і яны вайны ня хочуць. Сацыял-фашысцкія брахуны пускаюць лухту аб «чырвоным імпэрыялізьме», а рабочых запэўніваюць, што іх урады да вайны ня рыхтуюцца, што Ліга Нацый стаіць на «варце міру», а дэманстрацыю рэвалюцыйнага пралетарыяту супроць імпэрыялістычных войн забараняюць ва ўсіх каліталістычных краінах і там, дзе ва ўладзе адкрытая фашысцкая дыктатура і там, дзе прыкрытая дыктатура буржуазіі дэмакратычнай шыльдай.

А справа ў тым, што ўвесь каліталістычны сьвет шалёным тэмпам рыхтуецца да новых імпэрыялістычных войнаў, да ўзброенага нападу на СССР. І каб замаскаваць, прыкрыць гэтую падрыхтоўку, буржуазныя палітыкі і сацыял-фашысцкія інтэрвэнты прымушаны заліваца «міралюбнымі салаўямі». Іх задача прысыпіць чуласьць пралетарыяту і працоўных мас, адцягнуць ад барацьбы супроць вайны, адцягнуць ад барацьбы ў абарону СССР.

Адсэтуль байкі аб «барацьбе» Лігі Нацый за мір, адсэтуль байкі, што ніводная каліталістычная краіна пэпер да вайны ня рыхтуецца і г. д. Але маноўры буржуазіі і яе лёкаяў сацыял-фашыстаў выкрывае авангард пралетарыяту—камуністычная партыя, якая заклікае і арганізуе ўсе працоўныя масы выступіць на вуліцу, прадэманстраваць сваю сілу і заявіць ва ўвесь голас—«Рукі прэч ад СССР», «Прэч з падрыхтоўкай новых імпэрыялістычных войн». Вось чаму з такой жорсткасьцю распраўляецца буржуазія ва ўсіх каліталістычных краінах супроць рэвалюцыйнай дэманстрацыі ў дзень 1 жніўня.

Эканамічны крызіс, крызіс усёй каліталістычнай сыстэмы прыняў надзвычайна шырокія разьмеры, а рад буржуазных краін стаіць напярэдадні гаспадарчай катастрофы, на краю пагібелі. І каб выбрацца з гаспадарчага крызісу, каб выратаваць сваё клясавае панаваньне, буржуазія пры дапамозе сацыял-фашыстаў, вядзе наступленьне на жыцьцёвы ўзровень рабочае кляасы і ўсіх працоўных і шалёным тэмпам рыхтуецца да вайны. Каліталістычная рацыяналізацыя пазбавіла мільёны рабочых работы, значна пагоршылася ўмовы тых рабочых, якія яшчэ маюць на сёньняшні дзень работу. Яны працуюць па 12-14 гадзін за паўголодны заработак. Сацыяльнае страхаваньне з кожным днём скарачаецца, зводзіцца да нуля. 25 мільёнаў беспрацоўных і сотні мільёнаў галадуючых. І ўтой час, калі ўся прамысловасьць скарачаецца, калі асноўныя галоўныя галіны прамысловасьці загружаны толькі на 25—30 проц. сваіх вытворчых магчымасьцяў, вайсковая прамысловасьць працуе поўным ходам.

Пры ўсім стараньні буржуазіі і яе лёкаяў—сацыял-інтэрвэнтаў ім не ўдаецца і ня ўдасца пераканаць пралетарыят і працоўныя масы, у тым, што выробляюць вайсковыя заводы гавыя бомбы, далёкабойныя гарматы, кулямёты і г. д. для забавы. Рабочая кляса і працоўныя масы добра ведаюць, на якія мэты прызначана гэтае ўзбраеньне. Яно прызначана на прыдушэньне рэвалюцыйнага руху ўнутры краіны, яно прызначана для зьнішчэньня працоўных іншых краін. Працоўныя масы ўсяго сьвету памятаюць усе жахі імпэрыялістычнай вайны. Памятаюць прадажніцкую ролю II Інтэрнацыяналу, які цалкам стаў на пазыцыю буржуазіі і дапамагаў ратавацца «сваёй» буржуазіі, дапамагаў падняволь ваць, рабаваць іншыя нацыі, іншыя народы.

Імпэрыялісты рыхтуюць новую вайну, якая яшчэ большыя спусташэньні, яшчэ большыя жахі бядоты працоўных.

Пралетарыі ўсяго сьвету актыўна вядуць барацьбу супроць новых імпэрыялістычных войнаў і пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам штабу сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі—Камінтэрну, не ратаваць вайну імпэрыялістычную ў вайну грамадзянскую.

Рабочая кляса, калгасьнікі, усе працоўныя Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК ідуць ад перамогі да перамогі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Рост нашага сацыялістычнага будаўніцтва, рост нашай магутнасьці і абароназдольнасьці выклікаюць шалёную нянавісьць сусьветнай буржуазіі, якая імкнецца за кошт СССР выбрацца з тупіка гаспадарчага крызісу.

У дзень 1 жніўня рабочая кляса, калгасьнікі, усе працоўныя Савецкага Саюзу прадэманструюць непахісную адданасьць свайму авангарду—камуністычнай партыі і сваю гатоўнасьць у любую хвіліну стаць грудзьмі на абарону СССР. Працоўныя СССР ведаюць, што наша партыя, наш урад са праўды праводзяць мірную палітыку, сапраўды змагаюцца за мір. Гэтую палітыку міру мы будзем і надалей праводзіць. Але няхай памятаюць імпэрыялістычныя драпежнікі, што «узброены напад на СССР цяпер азначае галоўную небясьпеку для тых, хто адважыцца парушыць мір і напасьці на Савецкі Саюз». (Молатаў).

Няхай жыве 1-га жніўня, дзень барацьбы супроць імпэрыялістычных войн у абарону СССР!

Аб ходзе ўборкі ўраджаю і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы

Пастанова бюро Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

1. Цэнтральны Камітэт прызнае ход ажыцьцяўленьня ў БССР рашаючых мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць пасьпяховасьць кампаніі ўборкі ўраджаю і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы не здавальняючым.

а) Асабліва ў кепскім становішчы зна ходзіцца справа з практычным ажыцьцяўленьнем зьдзельшчыны ў калгасах і з падрыхтоўчаю работаю да разьмеркаваньня ўраджаю (затрымкі з выдачаю працоўных кніжак, усё яшчэ нездавальняючая пастаноўка ўліку і запісі адпрацаваных дзён і г. д.).

б) Цэнтральны Камітэт КП(б)Б поўнасьцю далучаецца да паказаньняў газэты «Праўда» і адзначае недапушчальна слабыя тэмпы барацьбы за практычнае ажыцьцяўленьне ў калгасах зьдзельшчыны, а таксама канстатуе, што ў выніку слабай барацьбы з кулацкай «ураўнілаўкай» у калгасах мелі месца выпадкі ўраўніцельнага разьмеркаваньня кармоў.

в) З гэтых-жа прычын выцякае нездавальняючы ход сенаўборкі і наяўная рэальная пагроза зрыву сіласаваньня.

г) У пераважнай большасьці раёнаў таксама не вядзецца ніякай падрыхтоўчай работы да перакідкі ў час ўборкі рабочай сілы з найбольш забясьпечаных рабочымі рукамі калгасаў у саўгасы і найменш забясьпечаныя рабочаю сілаю калгасы.

2. Цэнтральны Камітэт КП(б)Б з асаблівай сілай падкрэсьлівае неабходнасьць у яшчэ большай меры сканцэнтраваць усю ўвагу, усе сілы і бальшавіцкую волю і настойлівасьць кожнай партыйнай ячэйкі і партыйца, пасобку, усёй КП(б)Б у цэлым, на самай рашучай і пасьлядоўнай барацьбе з адзначанымі вышэй апартуністычнымі скажэньнямі лініі партыі ў калгасным будаўніцтве, за поўнае і няўхільнае ўвядзеньне зьдзельшчыны, за свячасовае выяўленьне і разьмеркаваньне ліквідкаў рабочай сілы, за далейшы магутны прыліў у калгасы; за выкананьне задачы сусьветнай калектывізацыі с.-г. і ліквідацыю на гэтай базе кулацтва як кляасы.

а) Партыйным арганізацыям неабходна забясьпечыць самае шырокае растлумачэньне як калгасьнікам, так і ад наасобнаму сэктару—бядняцка-сераднякім гаспадаркам задач уборачнай кампаніі, завастраючы асаблівую ўвагу на пытаньнях барацьбы з кулацкай ураўнілаўкай, на неабходнасьць поўнага ажыцьцяўленьня ва ўсіх калгасах зьдзельшчыны, выяўленьня і разьмеркаваньня лішкаў рабочай сілы, папярэдняй грунтоўнай падрыхтоўкі да разьмеркаваньня ўраджаю, на разьмеркаваньні кармоў, на выдачу калгасьнікам авансаў выключна ў залежнасьці ад адпрацаваных працадзён і г. д.

3. Прапанаваць усім райкомам КП(б)Б райвыканкомам, саўгастрэстам і Белкалгасцэнтру правесьці наступныя мерапрыемствы:

а) Уборку натуральных сенажацяй скончыць да 5-га жніўня;

б) уборку азімых у паўднёвай і сярэдняй зоне—да 5 жніўня і паўночнай зоне—да 10-га жніўня.

в) Плян сіласаваньня кармоў выканаць да 1-га верасьня ня менш, як на 65 проц., і на 100 проц. да 1-га кастрычніка 1931 г.

г) Пасеў азімых у паўночнай зоне скончыць да 1 верасьня, у сярэдняй зоне—да 5 верасьня і ў паўднёвай зоне—да 10 верасьня.

д) Уборка ільну ў паўднёвай зоне скончыць да 25-га жніўня, у сярэдняй зоне—да 30 жніўня і ў паўночнай зоне—да 5 верасьня. Райвыканкомам і райкомам устанавіць цьвёрдыя тэрміны ўборкі бульбы для кожнага саўгасу і калгасу з такім разьлікам, каб да 1 кастрычніка было ўбрана ня менш 75 проц. і на 100 проц. да 1 кастрычніка.

4. Абавязаць Саўгастрэсты, Трактарацэнтр скончыць рамонт трактараў да 5 жніўня, прыняўшы ўсе захады да скарыстаньня трактараў выключна на пахаці і падняцьці цэлінных зямель з тым, каб у гэтым годзе было паднята ня менш 250.000 гэкт. цаліны, з іх пад кармовыя культуры 100.000 гэкт. і пад лён 150.000 гэкт.

5. Адзначаючы абсалютна няўважлівыя адносіны раду цэнтральных гаспадарчых і раённых установ і арганізацый да застаўленьня плошчы пад насеньнікамі шматгадовых траў, збору дзікарастучых траў, абавязаць кіраўнікоў цэнтральных гаспадарчых арганізацый, сакратароў райкомаў КП(б)Б і старшынь райвыканкомаў забясьпечыць застаўленьне плошчаў пад насеньнікамі, пакрызаючае патрэбу ў насеньні кармавых культур у 1932 г.

6. Абавязаць Наркамзем, Белкалгасцэнтр і саўгастрэсты выдаць адпаведныя паказаньні на месцы аб своячасовай і поўнай уборцы і абмалоце ўраджаю, поўным скарыстаньні наяўных с.-г. машын і ажыцьцяўленьні іншых мерапрыемстваў з тым, каб страт пры ўборцы ўраджаю не дапусьціць.

7. Райкомам і райвыканкомам, побач з замацаваньнем існуючых калгасаў, правядзеньнем абагульваньня пасевaў, прыняць усе захады да далейшага, яшчэ большага ўзмацненьня тэмпаў калектывізацыі бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

8. Адзначаючы затрымку, а па некаторых катэгорыях—амаль поўны зрыў падрыхтоўкі масавых кадраў да ўборачнай кампаніі, прапанаваць Наркамзему, Белкалгасцэнтру і райкомам КП(б)Б не пазьней 10-га жніўня скончыць поўнасьцю падрыхтоўку кадраў, а таксама перакідку калгасьнікаў у ліку 30.000 для перанясеньня вопыту лепшых калгасаў у новыя.

9. Белсельгасснабу, Сампрамсаюзу і ВСНГ забясьпечыць выраб с.-г. машын, машын па апрацоўцы ільну і бульбакапалак, забясьпечыўшы хутчэйшы завоз іх і прасоўваньне да саўгасаў і калгасаў.

10. Абавязаць фракцыю ЦСПСБ без адкладна прыняць канкрэтныя захады па забясьпячэньні непасрэднай дапамогі прыгарадным гаспадаркам па прапоўцы і ўборцы гародных культур.

11. Даручыць агітмасавому аддзелу ЦК КП(б)Б, пры ўдзеле Наркамзему мабілізаваць на месяц 75 работнікаў цэнтральнага маштабу ў жасьці ўпаўнаважаных ЦК на правядзеньні ўборачнай кампаніі і наладжваньні вучоту працы ў калгасах.

Абавязаць мабілізаваных таварышоў у 5-ці дзённы тэрмін выехаць на месцы прызначэньня.

а) У распараджэньне ўпаўнаважаных ЦК па правядзеньні ўборачнай кампаніі камандыраваць 30 прыезжаючых студэнтаў Ленінградзкага камвузу і 20 студэнтаў прадапошняга курсу с.-г. ВУЗ'аў БССР, увязаўшы для іх гэту работу з прахаджэньнем вытворчай практыкі.

12. У мэтах мабілізацыі самых шырокіх рабочых і калгасных мас на правядзеньне ўборкі ўраджаю, падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы і зяблевага ворыва, арганізаваць па прыкладу вясеньняй пасеўкампаніі конкурс на свае часовае і поўнае правядзеньне ўборкі ўраджаю, асеньняй сяўбы і зяблевага ворыва, стварыўшы пры ЦК штаб у складзе прадстаўнікоў ЦК. Наркамзему, Белкалгасцэнтру, ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ і рэдакцыі газэты «Зьвязда».

13. Адзначаючы, што масавая растлумачальная работа навакол разьмеркаваньня прыбыткаў ўраджаю ў калгасах да апошняга часу не разгорнута, абавязаць НКЗ, Калгасцэнтр, райкомы і рэдакцыі цэнтральных і раённых газэт узмацніць работу ў галіне шырокага і сыстэматычнага растлумачэньня парадку разьмеркаваньня прыбыткаў у калгасах, разам з тым рашуча змагаючыся супроць якіх-бы то ні было скажэньняў лініі партыі ў калгасным будаўніцтве (разьмеркаваньне на едакох, устанаўленьне пайкоў і г. л.).

14. Пастанову апублікаваць у друку.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

па дакладу НКЗ-му БССР аб ходзе ўборачнай і падрыхтоўцы да асеньняй пасеўнай кампаніі

Няўхільна ажыцьцяўляючы пастановы VI-га Усесаюзнага і X-га Усебеларускага Зьезду Саветаў рабочая кляса пад кіраўніцтвам Камуністычнай Партыі абапіраючыся на калгасьнікаў у саюзе з бядняцка-сераднякім сялянствам скончыла вясеньнюю сяўбу ў 1931 г. з вялізарнымі перамогамі ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Вынікі вясновай пасеўнай кампаніі 1931 г. з усёй відавочнасьцю паказваюць, што калгасны рух у БССР атрымаў значныя перамогі, рад раёнаў БССР ужо падышоў да завяршэньня ў адноўным калектывізацыі бядняцка-сераднякіх гаспадарак, а такія раёны як Койданаўскі, Лепельскі яе завярцылі, гэта гаворыць за тое, што калектывізацыя ў БССР можа быць у асноўным завершана ў 1932 г.

Асноўная маса саўгасаў і калгасаў у багучую вясеньнюю сельскі-гаспадарчую кампанію пасьпяхова справілася з правядзеньнем сяўбы і дала ўзоры сапраўднай продукцыйнай працы, відавочна паказаўшы усе перавагі буйнай сацыялістычнай гаспадаркі перад дробнай аднаасобнай.

Завяршэньне ў адноўным калектывізацыі ў 1932 годзе будзе магчыма тады, калі ўсе савецкія і грамадзкія арганізацыі мабілізуюць усю ўвагу гэтаму пытаньню з тым разьлікам, каб да вясновай сяўбы 1932 г. было калектывізавана ня менш 75 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак, для чаго неабходна максымальна скарыстаць асеньні і зімовы час, поўнасьцю ўвязваючы ўборачную, асеньнюю пасеўную, зяблевую, сілосную кампанію і падрыхтоўчую працу да правядзеньня трэцяй бальшавіцкай вясны з задачамі калектывізацыі. Гэта асабліва тычыцца тых раёнаў, якія адстаюць па тэмпах калектывізацыі.

На гледзячы, аднак, на дасягнутыя посьпехі ў справе калектывізацыі бядняцка-сераднякіх гаспадарак і правядзеньне вясеньняй сяўбы, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР зварочвае ўвагу ўсіх савецкіх і грамадзкіх арганізацый на ўсю сур'ёзнасьць і напружанасьць задач уборачнай кампаніі.

Усе савецкія і грамадзкія як цэнтральныя, так і мясцовыя арганізацыі павінны улічыць, што ўборачная, асеньняя пасеўная, сілосная кампанія 1931 г. зьяўляецца рашаючымі вучасткамі выкананьня ўсяго народна-гаспадарчага пляну 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Пры правядзеньні ўборачнай асеньняй пасеўнай кампаніі неабходна ўлічыць урокі мінулага году.

Ход уборкі сенажацяй, азімых, сіласаваньня кармоў, падрыхтоўка глебы для азімай пасеўнай кампаніі сьведчаць, што цэнтральныя, савецкія, гаспадарчыя і раённыя і грамадзкія арганізацыі не забясьпечылі бальшавіцкіх тэмпаў, у выніку чаго ўборка сенажацяй, сіласаваньне кармоў знаходзіцца ў зусім нездавальняючым становішчы.

Выходзячы з гэтага, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць усе Саветы, раённыя выканаўчыя камітэты, Цэнтральныя савецкія і гаспадарчыя арганізацыі забясьпечыць выкананьне намечаных планаў уборкі ўраджаю, сіласаваньня кармоў і правядзеньне асеньняй сяўбы і зяблевага ворыва.

2. Абавязаць Саўгастрэсты, Калгасцэнтр забясьпечыць скарачэньне сенаўборкі не пазьней 5 жніўня г. г. разгарнуўшы працу з тым разьлікам, каб абазвяжова была забясьпечана уборка двух укосаў залёўных сенажацяй, зьвярнуўшы пры гэтым увагу на сенаўборку ў сенагадоўчых саўгасах.

3. Усю працу ў калгасах арганізаваць такім чынам, каб абсалютна ўсе работы праводзіліся на паставе сапраўднай зьдзельшчыны, забясьпечыўшы дакладны запіс працадзён у кніжках калгасьнікаў і зрабіўшы самыя формы зьдзельшчыны найбольш простымі і зразумелымі кожнаму калгасьніку.

Рашуча і зараз-жа ліквідаваць абязьлічку на ўсіх бяз выключэньня с.-г. машынах, пры выкарыстоўваньні коняй і рогнага інвэнтара арганізаваць поўнае скарыстаньне магутнасьці кожнай машыны.

Наладзіць самыя беражлівыя адносіны да с. г. машын.

4. Прапанаваць усім цэнтральным і мясцовым савецкім і гаспадарчым арганізацыям зьвярнуць асаблівую ўвагу як уборцы лёк і першачарговай апрацоўцы тэхнічных культур—лёну і канапель, плошча пасеву якіх у гэтым годзе значна пашырана. У пасобку ўжыць самыя рашучыя захады да своячасовага скончэньня будаўніцтва заводаў па першапачатковай апрацоўцы пералікаваных культур. Адзначыць, што будаўніцтва гэтых заводаў у сучасны момант праходзіць нездавальняюча.

5. Абавязаць усе гарадзкія саветы і грамадзкія арганізацыі гарадоў мабілізаваць усе сілы на дапамогу прыгарадным гаспадаркам, вызначыўшы зараз канкрэтныя і рэальныя пляны дапамогі рабочай кампэрацыі. Паказаць Менскаму, Гомельскаму, Віцебскаму, Магілёўскаму, Бабруйскаму і Аршанскаму гарсаветам на тое, што паляпшэньне рабочага забясьпечаньня будзе ў значнай меры залежыць ад таго наколькі яны могуць своячасова правясьці ўборку ўраджаю ў прыгарадных гаспадарках.

6. У бягучую ўборку ўраджаю асабліва адказныя задачы ўскладаюцца на МТС, як на магутны сродак калектывізацыі бядняцка-сераднякіх гаспадарак, тэхнічнага перабудаваньня калгасаў. МТС абавязаны ня толькі выканаць, але і перавыканаць даныя ім вытворчыя заданьні па ўдыме папару па ворыве пад зяб, уборцы ўраджаю, а таму мясцовыя арганізацыі павінны забясьпечыць штодзённую ўвагу і дапамогу МТС.

7. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт папярэджвае супроць магчымых выпадкаў недаацэнкі і ігнараваньня ўборачнай кампаніі аднаасобнага сэктару сельскай гаспадаркі, які ў ўмовах БССР займае вялікае месца. Цэнтральныя і мясцовыя, савецкія і грамадзкія арганізацыі павінны забясьпечыць правільнае кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеньнем уборкі ўраджаю бядняцка-сераднякімі аднаасобнымі гаспадаркамі, увязаўшы гэтую работу з арганізацыяй далейшага больш масавага прыліву сялян адзіноасобнікаў і калгасы.

8. Улічваючы неабходнасьць павышэньня выхаду ўраджаю і барацьбы са стратамі ва ўсіх сэктарах сельскай гаспадаркі, Народнаму Камісарыяту Земляробства, раённым выканаўчым камітэтам, саўгастрэстам і Калгасцэнтру прыняць усе захады да правядзеньня барацьбы са стратамі ў сельскай гаспадарцы пры ўборцы і абмалоце ўраджаю.

9. Улічваючы асабліва важнае значэньне нацыянальных нарыхтоўчых кампаній, абавязаць усе савецкія арганізацыі ўвязаць правядзеньне ўборачнай кампаніі з нарыхтоўкай збожжа, тэхнічных культур, бульбы і гародніны. Наркамзему, Наркамснабу, Калгасцэнтру і саўгастрэстам забясьпечыць не толькі ўборку ўраджаю, але і здачу (продаж) таварнай продукцыі дзяржаве.

10. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства і раённым выканаўчым камітэтам ужыць захады да сапраўднага ўкараненьня спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі ў практыку работы ўсіх арганізацый у напрамку разьвіцця жывёлагадоўлі і тэхнічных культур.

11. Ва умовах разгорнутага наступленьня соцыялізму па ўсім фронце і абостранай клясавай барацьбы—работа кожнай савецкай і грамадзкай арганізацыі павінна адзьняцца не на аснове таго, як яна на словах і рэвалюцыях паказвае прыклады барацьбы за генэральную лінію партыі супроць кляса ворага і яго агентуры унутры партыі правым і «левым» апартунізмам,—на аснове таго, як кожная арганізацыя разгортвае сапраўдныя тэмпы па ажыцьцяўленьні напружаных задач уборкі ўраджаю 1931 г.

12. Лічыць неабходным шырокае асьвятленьне ходу і вынікаў кампаніі ў органах друку. Адзначаючы, што Усебеларуская ўборачная эстафэта саветаў, якая праводзіцца газэтай «Савецкая Беларусь» зьяўляецца магутным сродкам у справе мабілізацыі шырокіх працоўных мас гораду і вёскі на правядзеньне ўборачнай кампаніі, Прэзыдыум ЦВК прапануе ўсім РВК, гарадзкім і сельскім саветам разгарнуць шырокую работу па ўцягненьні савецкай грамадзкасьці ў гэтую працу і з свайго боку аказваць газэце «Савецкай Беларусі» усялякае садзейнічаньне.

13. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР зварочваецца да ўсіх рабочых саўгасаў, калгасьнікаў, калгасьніц, бядняцка-сераднякіх насельніцтва і ўсіх працоўных прыняць захады да правядзеньня сапраўдна-бальшавіцкіх тэмпаў уборачнай, асеньняй пасеўнай, сілоснай і зяблевай кампаніі, разгарнуўшы пры гэтым сацыялістычныя мэтады працы сацпаборніцтва, ударніцтва і г. д.

Час. вык. аб. старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Гнілякевіч.

За сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **Б. Вансоўскі.**
25 ліпеня 1931 г.
г. Менск.

Супроць імпэрыялістычных войн,

у абарону СССР—будуць дэманстраваць у дзень 1 жніўня працоўныя ўсяго сьвету

У РУМЫНІІ

ВЕНА. Як паведамляюць з Будапэшту, унітарны прафсавет Румыніі выпусьціў адозву аб масавай падрыхтоўцы да правядзеньня дня 1-га жніўня.

У адозьве выстаўлены наступныя лёзунгі: «На барацьбу супроць дарагоўлі, масавых звальненьняў, скарачэньня заработку, на барацьбу супроць новага закону аб абароне дзяржавы, супроць імпэрыялістычнай вайны на абарону сацыялізму ў Савецкім Саюзе. У сувязі з фашысцкім паходам на рэвалюцыйны друк, ЦК рабоча-сялянскага блёку заклікае ўсіх працоўных Румыніі стварыць фонд барацьбы супроць прасьледаваньня рэвалюцыйнага друку.

У ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 28. У сувязі з набліжэньнем міжнароднага дня барацьбы супроць імпэрыялістычных войнаў і ўзброенага нападу на СССР, па ўсёй Польшчы адбываюцца масавыя аблавы, вобыскі і арышты. Урад прымае ўсе меры, каб не дапусьціць выступленьня рэвалюцыйнай дэманстрацыі рабочых і сялян. Маблізуюцца паліцэйскія школы для «падтрыманьня» парадку ў дзень 1-га жніўня.

Як паведамляе польскі друк, камуністычная партыя Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны разгарнула шырокую кампанію падрыхтоўкі да 1-га жніўня. Кампартыя распаўсюджвае адозвы, у якіх выкрывае палітыку фашызму, выкрывае яго імпэрыялістычныя драпежніцкія пляны па падрыхтоўцы вайны супроць СССР.

Напярэдадні 1-га жніўня ў краінах капіталу

У Бэльгіі

ПАРЫЖ, 28-VII. Як паведамляе «Юманітэ» бэльгійская кампартыя арганізавала мітынг пратэсту ў Брусэлі супроць рэпрэсій, накіраваных да прыдушэньня паўстаўшых тубыльцаў у бэльгійскім Конго.

Адначасова мітынг праходзіў пад лёзунгамі барацьбы за штодзённыя патрабаваньні рабочых і супроць ваенных падрыхтовак. Паміж паліцыяй і ўдзельнікамі мітынгу пачалася барацьба, якая працягвалася на працягу каля адной гадзіны. У час сутычкі 7 паліцэйскіх паранена сур'ёзна і 20 лёгка. Арыштавана 56 чалавек.

МЭЛОН У ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ. Міністр фінансаў ПАЗШ Мэлон прыбыў з Лёндану ў Парыж.

ПАРЫЖ. Як паведамляюць з Мадры да сацыяліст Бэйстэро канчаткова зацьверджаны старшынёй ўстаноўчага сходу.

„Лекі" гнілога капіталізму

„Рабочыя" міністэр Англіі—пасрэднікі „выратаваньня" Нямеччыны

БЭРЛІН, 28-VII. Агенцтва Вольф паведамляе: «На банкеце ў гонар ангельскіх міністраў, Брунінг, зьвярнуўшыся з прывітаньнем да ангельскіх міністраў, заявіў, паміж іншым, наступнае: «Нямецкі народ з падзякай адносіцца да гэтага знаменнага першага наведваньня кіруючых ангельскіх дзяржаўных людзей. Вы прыяжджаеце ў Нямеччыну ў момант, поўны цяжкіх клопатаў. Мы з падзякаю прызнаем, што зрабіў для нас ангельскі ўрад безадкладным прыняцьцем прапановы Гувэра. Мы ведаем, што Англія праходзіць праз цяжкія часы. Таму я ўпэўнены ў тым, што сапраўднае грунтоўнае аздараўленьне эканамічных умоў Эўропы магчыма толькі пры лёяльным супрацоўніцтве ўсіх народаў і пры аказаньні ім узаемнай дапамогі. Фундамант такога супрацоўніцтва закладзены ў Лёндане. Цяпер неабходна прыступіць да пабудовы самога будынку».

Адказваючы Брунінгу, Макдональд заявіў: «Мы прыехалі ў Бэрлін ня толькі для таго, каб адказаць на візыт нямецкіх міністраў у Англію. Мы прыехалі сюды таксама і для таго, каб паказаць, усяму сьвету, што ня гледзячы на цяперашнія труднасьці, наша давер'е да Нямеччыны ніколькі ня зьменшылася. У Лёндане справа ішла толькі аб тым, каб увайсьці ў становішча, пакуль будзе рабіцца падрыхтоўка да больш грунтоўнай перамогі труднасьцей.

Будучыя пакаленьні павінны накіраваць усе свае намаганьні на тое, каб узьняць дабрабыт ва ўсім сьвеце. Асноўныя прычыны сучаснага крызісу павінны быць, нарэшце, ясна асьветлены і да шчасьлівай іх перамогі павінна быць накіравана добрая воля ўсіх. Перш за ўсё павінна быць адноўлена пачуцьцё ўзаемнага давер'я пасьля чаго яно павінна быць распаўсюджана на ўзаемаадносіны паасобных дзяржаў. С часу закрыцьця лёндзенскай канфэрэнцыі ўжо адбыліся сур'ёзныя падзеі. У сувязі з гэтым я хацеў-бы прызнаць значэньне дапамогі, аказанай Францыяй і выказаць пажаданьне, каб пераговоры паміж нямецкім і французкай дзяржаўнымі дзеячамі былі працягнуты, калі патрэбна, пры ўдзеле представіцеляў іншых краін. Мы павінны забыць аб мінулым, бо будучая справа залежыць ад палітыкі, якой будуць кіравацьць толькі людзі, прасякнутыя добрай воляй і духам супрацоўніцтва. Думкі і пачуцьці маладога пакаленьня павінны быць вызвалены ад усякай варожасьці і злабы і накіраваны на ўзаемнае разуменьне і аказаньне узаемнай дапамогі.

Фінансавы крызіс у Нямеччыне.
Наўтон укладчыкаў каля дзьвярэй ашчадкас

У дзень першага жніўня—на вуліцу!

Да ўсіх працоўных Заходняй Беларусі, да ўсіх рабочых фабрыкі Ляйтэйшнэйдэр - Лейпцыгу

(З адозвы рабочых заводу Варашылава)

Рабочыя заводу Варашылава ў сваім звароце да ўсіх працоўных Заходняй Беларусі і рабочых фабрыкі Ляйтэйшнэйдэр у Лейпцыгу (Нямеччына) пішуць.

«Пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі і яе ЦК на чале з тав. Сталіным мы ўжо ў 1931 годзе заканчваем пабудову сацыялістычнай эканомікі ў Савецкім Саюзе; цэлы рад рашаючых прадпрыемстваў скончылі свой пяцігадовы плян у два з паловай гады. Слухайце браты па клясе і крыві, сяляне Заходняй Беларусі, Лейпцыгу. Ці ведаеце вы, што рабочая кляса Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі на чале з тав. Сталіным ў гэтым трэцім рашаючым годзе пяцігодкі пускае ў ход 518 фабрык і заводаў, 1040 машына-трактарных станцый. Мы ўжо да гэтага часу маём у эксплёатацыі новых 183 фабрыкі і заводы. Мы ўжо зараз з трухлявага, старога коніка ў сельскай гаспадарцы перайшлі на сталёвага каня—трактар і камбайн.—Мы будуем сацыялізм у нашай краіне, мы выконваем бальшавіцкі пяцігадовы плян у чатыры гады і яшчэ больш шпарка.

«ВАША СПРАВА, — заяўляюць—рабочыя варашылаўцы,—НАША РОДНАЯ КРОЎНАЯ СПРАВА. Мы рабочыя і калгасныя сяляне Савецкай Беларусі як і ўсяго Савецкага Саюзу,—ваша ўдарная брыгада.

Рапартуючы аб дасягненьнях пралетарыяту БССР рабочыя варашылаўцы заклікаюць працоўныя масы Заходняй Беларусі і Нямеччыны дэманстраваць у дзень 1-га жніўня сваю непахісную гатоўнасьць да барацьбы супроць імпэрыялістычных войн, супроць імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі на Савецкі Саюз.

«Мы заклікаем вас—у дзень 1-га жніўня хай вуліцы гарадоў, мястэчак, вёсак, убачаць вашы баявыя выступленьні. Выступайце супроць дыктатуры фашызму, супроць налёту імпэрыялістаў на краіну саветаў, за вашу сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне. Мы горача вітаем вашу геройную барацьбу супроць крывавай фашысцкай дыктатуры.

Няхай жыве КПП і КПЗБ, КПГ—арганізатары і кіраўнікі працоўных мас у надыходзячых баёх за дыктатуру пралетарыяту.

Няхай жыве кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва—УсеКП(б) і яе Ленінскі ЦК на чале з тав. Сталіным.

Няхай жыве гераічная барацьба працоўных мас Заходняй Беларусі і Нямеччыны.

У міжнародны чырвоны дзень—на вуліцу. Дэманструйце супроць падрыхтоўкі новай сусьветнай бойні.

(Ліст падпісан 200 рабочымі заводу імя Варашылава).

Сваячасовая праполка і ўборка

рашае пытаньне забесьпячэньня рабочых і служачых гораду прадуктамі гародніны і садовіны на цэлы год

Арганізаваць штодзённы масавы выхад у поле

Да ўсіх прафарганізацый і членаў прафсаюзаў гор. Менску

Рабочыя і служачыя гораду Менску на чале з прафарганізацыямі за час веснавой сяўбы і праполкі паказалі геройныя узоры брацкай працоўнай дапамогі [illegible] прыгарадным саўгасам і калгасам.

З маючыхся ў гарпрафсавеце няпоўных вестак відаць, што да 18 ліпеня адпрацавана 56.000 працадзён. Але побач з гэтымі посьпехамі неабходна [illegible], што за апошнюю дэкаду [illegible] працоўная дапамога значна па[illegible].

Наша сацыялістычнае поле асабліва ў гэтую і наступныя 2 дэкады больш чым калі патрабуюць дапамогі.

Поўнасьцю набыпела 2-я полка і ў гэты час і ўборка раньніх культур (бульба, ягады, гуркі і г. д.).

Таварышы фабкомы, заўкомы, рабфакомы, мясцкомы і ўсе рабочыя і служачыя!

Неабходна зараз-жа перавесьці гэту работу на ўдарныя баявыя рэйкі. Поўнасьцю выканаць узятыя на сябе абавязкі па ўмовах аб дапамозе. Своячас

Раўняцца па калгасах „Энэргія“, „Праўда“ і „Чырвоны Ельск“,

якія па-бальшавіцку справіліся з сенаўборкай і канчаюць уборку жыта

Койданаўскі, Крупскі, Менскі, Чырвона-Слабодзкі, Лёзьнянскі, Слуцкі і Бабруйскі раёны разьмеркаваньне сенажаці пусьцілі па кулацкай указцы. Неадкладна выправіць прарывы. Забясьпечыць сваячасовую ўборку і правільнае разьмеркаваньне ўраджаю

Уборачная эстафэта савецкай

Скончыць поўнасьцю сенаўборку да 5 жніўня

Усім старшыням РВК

Сенаўборка праходзіць нездавальняюча. Тэрміны сканчэньня ўборкі мінулі. Маюцца значныя плошчы натуральных сенажацяй з няскончанай уборкай сена, якія скарыстоўваюцца пад выпас. Ёсьць пагроза, што па паасобных раёнах значная плошча сена застанецца няўбранай.

Пад вашу адказнасьць прапаную правесьці дэкаднік сенаўборкі, скончыўшы яе поўнасьцю да 5 жніўня, разгарнуць арганізацыю ўдарных брыгад, узяць адстаючыя сельсаветы, саўгасы і калгасы на грамадзкі буксір.

Для кіраўніцтва справай дэкадніка мабілізуйце актыў.

Старшыня СНК БССР БЭНЭК.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб удзеле жанчын ва ўборачнай кампаніі

Пасьпяховае правядзеньне ўборачнай і пасеўнай кампаній і далейшае масавае разгортваньне калектывізацыі, як рашаючага вучастку ў выкананьні ўсяго народна-гаспадарчага пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі ў значнай меры залежыць ад таго, ў якой меры будзе разгорнута работа па прыцягненьні калгасьніц, батрачак, бяднячак і сераднячак адзіна-асобніц да ўдзелу ва ўборачнай кампаніі, да справы масавай калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх мас.

Выходзячы з гэтага, Прэзыдыум Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР лічыць неабходным ажыцьцявіць наступныя мерапрыемствы па мабілізацыі актыўнасьці жаночых мас да ўборачнай і зарыхтоўчай кампаній і ва ўсёй рабоце па перабудове сельскай агспадаркі:

1. Сельскім саветам правесьці сходы сельскага жаночага актыву (членаў сельсаветаў, дэлегатак, членаў камітэтаў КСУ) для шырокага абгаварэньня на гэтых сходах пастаноў ЦК КП(б)Б і Ураду аб уборачнай кампаніі, аб канкрэтных плянах уборачнай кампаніі і заданьняў па нарыхтоўках у разрэзе сельсаветаў; праўленьням калгасаў і саўгасаў склікаць масавыя сходы саўгасьніц, калгасьніц сумесна з аднаасобніцамі з абгаварэньнем канкрэтных плянаў уборачнай кампаніі ў саўгасе, калгасе пад знакам мабілізацыі ўсіх калгасьніц, аднаасобніц да пагалоўнага ўдзелу ва ўборачнай кампаніі на аснове шырокага разгортваньня сацспаборніцтва, ўдарніцтва паміж паасобнымі брыгадамі калгасьніц, да справы па суцэльнай калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх мас вёскі і ліквідацыі на аснове гэтага кулацтва як кляасы.

2. Сельскім саветам суцэльнай калектывізацыі арганізаваць жаночыя сельска-гаспадарчыя вытворчыя нарады ў складзе: жанчын-членаў сельскіх саветаў прадстаўніц дэлегацкіх сходаў калгасьніц, абраных на сходах калгасьніц, сельска-гаспадарчых работніц і батрачак выдзеленых прафсаюзнымі арганізацыямі, актывістак абраных на сходах жанчын. Кіраўніцтва жаночымі вытворчымі нарадамі ўскладаецца на старшыню сельскага савету.

На сельска-гаспадарчыя жаночыя вытворчыя нарады ўскладаецца: абгаварэньне і актыўнае садзейнічаньне ў правядзеньні плянаў сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, правядзеньне сярод жанчын аднаасобніц масавай работы па ўцягненьні ў калгасы, абгаварэньне і мабілізацыя жанчын на выкананьне плянаў уборачнай і хлебанарыхтоўчай кампаній, поўнае і правільнае скарыстаньне жаночай працы ў калгасах, вылучэньне рабочай сілы на адходзітва, садзейнічань не ліквідацыі аграныісьменнасьці сярод калгасьніц і нарыхтоўка з іх асяродзьдзя кваліфікаваных кадраў.

3. Жанчыны ў калгасах яшчэ далёка ня ўцягнуты ў вытворчую працу калгасу. Жаночая праца часта застаецца нескарыстанай нават у час найболь шага напружаньня працы—як вясеньняя пасеўная кампанія; жаночая рабочая сіла скарыстоўваецца па найменш кваліфікаваных галінах сельскай гаспадаркі, недастаткова калгасьніцы ўцягнуты ў сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Праўленьням калгасаў, райкалгасаюзам неабходна ўжыць захады да правільнага і поўнага скарыстаньня жаночай працы ў калгасах. У час уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаній стварыць паасобныя жаночыя брыгады жнеяк, па ўборцы лёну і ў іншых галінах працы, разгортваючы паміж паасобнымі брыгадамі соцыялістычныя формы працы сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Калгасцэнтру, раённым выканаўчым камітэтам і сельскім саветам праверыць і дабіцца выкананьня дырэктыў партыі і ўраду аб ўцягненьні калгасьніц ва ўсе вытворчыя працэсы ў калгасе ў пэрыяд сяўбы, ўборкі і апрацоўкі ўраджаю, вылучэньні на гаспадарчую кіруючую работу ў калгасах з мэтай арганізацыі пасьпяховага правядзеньня ўборачнай кампаніі і арганізацыі адходніцтва мужчынскай рабочай сілы.

Ня гледзячы на некаторыя посьпехі ў галіне выкананьня вызначаных да вясеньняй пасеўнай кампаніі сеткі бытавых устаноў, усё яшчэ марудна вылучаецца дырктыва Прэзыдыуму ЦВК аб правядзеньні масавай работы навакол пытаньняў арганізацыі бытавых устаноў за кошт мабілізацыі сродкаў насельніцтва, калгасаў, грамадзкасьці; разгортваньне сеткі бытавых устаноў у значнай меры адстае ад тэмпаў калектывізацыі.

Улічваючы, што ў час уборачнай кампаніі жанчыны поўнасьцю павінны быць ўцягнуты ў вытворчую працу калгасаў, раённым бытавым камітэтам, бытавым сэкцыям сельскіх саветаў, праўленьням калгасаў разам з усёй савецкай грамадзкасьцю арганізаваць мерапрыемствы па прасьцейшым масавым дагляздзе дзяцей і (дзяжурствы мацярэй, шэфства піанэратраду і г. д.), там, дзе немагчыма—арганізаваць сталыя альбо часовыя ясьлі.

Прэзыдыум Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР прапануе НКАсьвета, НКАховы здароўя раённым выканаўчым камітэтам правесьці даклад ную праверку становішча сеткі бытавых устаноў (ясьляй, пляцовак, сталовак) ў калгасах, саўгасах, шляхам заслухоўваньня дакладаў райінспэктуры асьветы, райздраваў аб становішчы бытавых устаноў, з мэтай замацаваньня часовых ясельных і дашкольных устаноў да канца ўборачнай кампаніі.

Час. выс. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

М. Гнілякевіч.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

Б. Вансоўскі.

25 ліпеня 1931 г. г. Менск.

Пастанова калегіі НКЗБ і праўленьня Белкалгасцэнтру

пра разгортваньне работы па растлумачэньні пастановы НКЗ і Калгасцэнтру СССР „Аб разьмеркаваньні прыбыткаў і ўраджаю ў калгасах і пра скажэньні дапушчаныя пры разьмеркаваньні кармоў“

1. Адзначыць, што нават да апошняга часу большасьць Райза і калгасаюзаў не разгарнулі масавай работы сярод калгасаў і калгасьнікаў па растлумачэньні пастановы НКЗ і Калгасцэнтру СССР аб прыкладным разьмеркаваньні даходаў ў калгасах у 1931 г. А **Койданаўскі, Крупскі, Менскі, Чырвона-Слабодзкі, Лёзьнянскі, Слуцкі, Бабруйскі** і рад іншых раёнаў, ня гледзячы на спэцыяльную дырэктыву Белкалгасцэнтру ад 6-VII-31 г. і рад далейшых паказаньняў, праявілі апартуністычную бязьдзейнасьць і не забясьпечылі кіраўніцтва ў справе разьмеркаваньня грубых кармоў у калгасах. У выніку гэтага рад калгасаў як зусім правільна паказваюць газэты «Правда» і «Зьвязда», дапусьцілі яўна кулацкія мэтады размеркаваньня ўраджаю грубых кармоў. Гэтыя скажэньні заключаюцца ў тым, што сена разьмяркоўваецца паміж калгасьнікамі для іх неабагуленай жывёлы да сканчэньня сенаўборкі непасрэдна на сенажаці без уліку колькасьці і якасьці працы калгасьнікаў, а па каровах, едакох і гаспадарках, бяз уліку патрэбнасьці ў кармох абагуленай жывёлы і здачы (продаж) дзяржаве грубых кармоў па кантрактацыі.

Такі кулацкі парадак разьмеркаваньня сена яўна супярэчыць **пастанове НКЗ і Калгасцэнтру СССР**, падрывае зьдзельшчыну і пагражае зрывам мерапрыемстваў па разьвіцьці абагуленай жывёлагадоўлі.

Таму **Наркамзем і праўленьне калгасцэнтру БССР пастанаўляюць:**

1. Прапанаваць усім загадчыкам Райза, старшыням Калгассаюзаў і дырэктарам МТС пад іх асабістую адказнасьць зараз-жа спыніць якое-б то ні было разьмеркаваньне грубых кармоў. Разьмеркаваньне павінна праводзіцца ў адпаведнасьці з **пастановай НКЗ і Калгасцэнтру СССР**, пасьля ўліку ўсяго сабранага ўраджаю, складаньня фуражных балянсаў, выкананьня кожным калгасам сваіх абавязкаў перад дзяржавай па здачы (продажы) і стварэньні фуражных фондаў для аграмаджанай жывёлы калгасу.

2. Абавязаць усе Райза, праўленьні Калгассаюзаў і МТС узмацніць работу па растлумачэньні **пастановы НКЗ і Калгасцэнтру СССР** аб прыкладным разьмеркаваньні прыбыткаў у калгасах, рашуча змагаючыся супроць кулацкіх тэндэнцый разьмеркаваньня прыбыткаў у калгасах па едакох, дварох і інш. кулацкіх ураўніцельных прынцыпах.

3. Абавязаць усіх работнікаў **НКЗ і Калгасцэнтру БССР** пасланых і пасылаемых у раёны для правядзеньня ўборачнай кампаніі цэнтр цяжару сваёй работы перажлучыць на справу разьмеркаваньня прыбыткаў у калгасах, папярэдзіўшы іх, што за недастаткове растлумачэньне калгасьнікам і калгасьніцам правільных прынцыпаў разьмеркаваньня прыбыткаў і ўраджаю ў калгасах і за непрыняцьце мерапрыемстваў супроць скажэньняў у гэтай справе, яны будуць адказваць нароўне з загадчыкамі Райза і старшынямі Калгасаюзаў.

4. Даручыць сэктару праверкі выкананьня НКЗБ, Аргмасаваму сэктару Белкалгасцэнтру ўзмацніць жывое кіраўніцтва і кантроль у галіне разьмеркаваньне прыбыткаў у калгасах, безадкладна рэагуючы на самае скажэньне **пастановы НКЗ і Калгасцэнтру СССР** аб прыкладным разьмеркаваньні прыбыткаў у калгасах.

Для ўзмацненьня гэтай работы і перароду калгасаў на зьдзельшчыну не пазьней 31-VII—г. камандыраваць у раёны ня менш 200 студэнтаў с. г. ВНУ.

5. За грубейшае скажэньне ў справе разьмеркаваньня сена ў калгасах загадчыку **Койданаўскага Райза**, тав. Жылкоўскаму абвесьціць суровую вымову з папярэджаньнем, а старшыні праўленьня **Койданаўскага Калгассаюзу** т. Хадасевіча з работы зьняць.

Загадчыкам Райза і старшыням Калгассаюзаў **Крупскага, Менскага, Чырвона-Слабодзкага, Лёзьнянскага, Слуцкага, і Бабруйскага** раёнаў за нядбайныя адносіны да растлумачэньня **пастановы НКЗ і Калгасцэнтру СССР аб** прыкладным разьмеркаваньні прыбыткаў у калгасах і непрыняцьце рашучых мер супроць кулацкай дзяльбы сена **абвесьціць вымовы.**

Папярэдзіць усіх загадчыкаў Райза, старшынь калгасаюзаў, дырэктараў МТС, а таксама ўсіх таварышоў мабілізаваных на правядзеньне ўборачнай кампаніі, што іх работа будзе ацэньвацца тым, наколькі хутка і правільна яны растлумачаць усім калгасьнікам і калгасьніцам **пастанову НКЗ і Калгасцэнтру СССР** аб прыкладным разьмеркаваньні прыбыткаў у калгасах, рашуча змагаючыся супроць кулацкай агітацыі і кулацкіх тэндэнцый у справе размеркаваньня прыбыткаў у калгасах.

Нам. Наркома Земляробства БССР **Масюкоў.**

Нам. старшыні праўленьня Калгасцэнтру БССР

Стрэле.

Скончылі ўборку жыта

Церахоўка, 27-7. (БЕЛТА). Калгасы «Вольная Праца», Гаруноўская сельсавету, і «Чырвоная Ніва», Церахоўская сельсавету, поўнасьцю скончылі ўборку азіміны. Калгас «Чырвоны аратыя», Кузьмінецкага сельсавету, убраў 80 га азіміны і на 40 проц. ярыны. Усе гэтыя калгасы зараз пачынаюць малацьбу. Ход малацьбы затрымліваецца недахватам складаных малацілак. Райкалгассаюз сваячасова не паклапаціўся аб завозе ў раён патрэбнай колькасьці гэтых машын.

Верашылаўскі суботнік па сенаўборцы

Магілеў (Наш. кар. На заклік Перакопскай дывізіі №-скі полк уключыўся ў варашылаўскі суботнік. Полк арганізаваў масавы выхад на дапамогу калгасьнікам па ўборцы сенажаці. Перад выхадам увесь полк абвясьціў сябе ўдарным. Чырвонаармейцы на сенаўборцы сапраўды паказалі бальшавіцкія тэмпы ў рабоце.

У час абедзеных перапынкаў шырока была прапрацавана пастанова НКЗ і Калгасцэнтру СССР аб прыкладным разьмеркаваньні прыбыткаў 1931 году. Гэтая пастанова выклікала вялікую актыўнасьць у чырвонаармейцаў. За адзін толькі дзень дзякуючы прапрацоўцы пастановы 486 чырвонаармейцаў пераменьнікаў падалі заявы аб уступленьні ў калгасы.

У прынятай пастанове чырвонаармейцы і камандна-палітычны склад палка ўзялі на сябе абавязак шляхам шырокай папулярызацыі пастановы НКЗ і Калгасцэнтру дабіцца новага прыліву чырвонаармейскіх гаспадарак у калгасы.

А. С.

Уборка пад пагрозай

Уборка сена і канюшыны ў саўгасе імя Будзёнага (Менскі прыгарадны раён) прайшла пасьпяхова. Саўгас скончыў яе яшчэ 9 ліпеня.

Аднак да ўборкі зернавых азімых культур саўгас яшчэ не падрыхтаваўся. Уборачныя машыны цалкам не адрамантаваны. Для жнеяк не закуплены запасныя часткі, нехапае некаторых асноўных частак. Майстэрня не спраўляецца з сваёй работай. Для рамонту некаторых машын няма матар'ялу. Саўгас ня мае снопавязалак.

Ток, сьвірны і тара не падрыхтаваны да складаньня ўбранага збожжа. У саўгасе неабходна пабудаваць новы сьвіран, але за гэта будаўніцтва саўгас яшчэ не браўся, хоць азімае збожжа пасьпела і трэба яго ўбіраць. Пытаньні ўборачнай яшчэ не абгавораны на сходзе рабочых.

Таксама не падрыхтавана правядзень не ўборачнай кампаніі на асновах зьдзельшчыны. Норм выпрацовак для зьдзельнай работы няма. Рабочыя не разьбіты на брыгады і г. д.

У самы кароткі час неабходна поўнасьцю падрыхтавацца да правядзеньня ўборачнай кампаніі, каб найлепш убрать ураджай.

Кіраўніцтва саўгасу і партыйная ячэйка на гэта пытаньне павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу.

А. З—кі.

Чавускі раён перавыканаў заданьне па акцыях Трактарацэнтру

Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь“

Рапарт

— На грунце правядзеньня масавай работы сярод калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас аб значэньні машына-трактарных станцый ў справе перабудовы дробнай сельскай гаспадаркі ў буйныя сацыялістычныя гаспадаркі, —Чавускі раён на 25 ліпеня заданьне па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру ў суме 36.000 руб. перавыканаў у суме 37.000 руб. або 102,7 проц. Прэзыдыум раённага выканаўчага камітэту пастанавіў ў зьвязку з датэрміновым выкананьнем заданьня, прасіць СНК БССР даць распараджэньне Беларускаму аддяленьню Трактарацэнтру датэрміновa прыступіць да пабудовы машына-трактарнай станцыі ў Чавускім раёне.

Па даручэньні прэзыдыуму Чавускага РВК.

Загадчык Райфа Елінеўскі.

***

Кантрольнае заданьне па рэалізацыі пазыкі «3-га рашаючага году» на 25 ліпеня па Чавускім р.па групе рабочых і служачых у суме 56.000 руб. выканана ў разьмеры 95.050 руб., або 169,7 пр. і па групе неарганізаванага насельніцтва—ў суме 10.000 руб. на 11.775 руб., або 117,7 проц.

Працягваецца работа па выкананьні сустрэчных плянаў па гэтых групах. Горш ідзе рэалізацыя пазыкі сярод калгасаў. Кантрольнае заданьне ў 90.000 руб. выканана толькі ў разьмеры 50.430 руб., або 56 проц.

Зусім недапучальна праходзіць рэалізацыя ў аднаасобным сэктары, сярод якога заданьне ў 181.000 руб. рэалізавана толькі на 2.985 р., або 1,6 пр.

Да канца месячніка засталіся лічаныя дні. Парт'ячэйкі і сельсаветы павінны скарыстаць энтузіязм лепшых перадавікоў калгасьнікаў, рэалізаваць ўмовы па сацспаборніцтву, заключаныя паміж асобнымі калгасамі на нарадзе старшынь калгасаў яшчэ 23 чэрвеня і да 5 жніўня выканаць на 100 проц. заданьне па калгасах і адна асобным сэктары.

Райкалгасаюзу трэба аддаць больш увагі рэалізацыі пазыкі сярод калгасаў.

Камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі, абвясьціўшыя сябе ўдарнымі ў справе дапамогі рэалізацыі пазыкі ў вёсцы, павінны выканаць узятыя на ся бе абавязкі і безадкладна аказаць сельсавету сапраўную дапамогу. РК ЛКСМБ і Райпрафсавету трэба прымацаваць асобныя МК і РМК і гарадзкія камсамольскія ячэйкі да асобных сельсаветаў і патрабаваць ад гэтых мясцкомаў і ячэек сапраўднай, ударнай дапамогі.

Заданьне па машынных абавязацельствах ў суме 20.170 руб. выканана на 15.450 руб., або 70,3 проц.

Як і на працягу 1 і 2 кварталу, ў справе мабілізацыі сродкаў цягнецца ў хвасьце спажывецкая каапэрацыя, квартальнае заданьне якой па паявых узносах ў суме 100.000 руб. на 20 ліпеня выканана ў разьмеры 3,8 проц. і мэтавых укладах у 26.000 руб.—на 18 пр.

Адпаведным органам безадкладна трэба прыняць рашучыя захады і пакласьці канец бязьдзейнасьці спажыўкаапэрацыі ў выкананьні фінпляну.

Плян мабілізацыі сродкаў 3-га кварталу зьяўляецца рашаючым у справе забесьпячэньня капітальнага будаўніцтва і разгортваньня загатовак ўсіх відаў. На яго выкананьне павінны быць мабілізаваны ўсе сілы. Руйнуючы ўдар па ўсіх зрыўшчыках фінпляну.

Елінеўскі.

Ад рэдакцыі. Рэдакцыя падтрымлівае хадайніцтва Чавускага РВК і са свайго боку просіць СНК аб датэрміновай пабудове ў раёне машына-трактарнай станцыі.

Жнівень--рашаючы месяц у барацьбе за торф

Скарыстаць вопыт і тэмпы рагачэўскіх тарфянікаў. Па-бальшавіцку змагацца за выкананьне і перавыкананьне плянаў па торфаздабычы!

Увага прамысловай тарфяной каапэрацыі

Прамысловая тарфяная каапэрацыя павінна даць у гэтым 1931 г. 215 тыс. тон паліўнага торфу для снабжэньня прамысловасьці БССР: як буйнай дзяржаўнай—100 тыс. тон, так дробнай мясцовай—70 тыс. тон. Акрамя гэтага для снабжэньня ўстаноў калгасаў і саўгасаў—45 тыс. тон. Як-жа тарфяны Сэктар Белкаапсаюзу спраўляецца з сваёй задачай?

Тут трэба проста з усёй рашучасьцю заявіць, што з пачатку сэзону, як праўленьне БКПС, так і Праўленьні РСП адносіліся да справы торфаздабычы яўна апартуністычна. Ніякай дапамогі ні ад праўленьня БКСП ні ад праўленьня РСП тарфяны сэктар не атрымліваў. Толькі пасьля таго, як партыя і савецкая ўлада паставілі пытаньне аб торфе з усёй рашучасьцю, калі была аб'яўлена барацьба за кожную тону торфу, толькі пасьля гэтага праўленьне БКПС і праўленьні некаторых асобных РПС уясьнілі сабе ўсю важнасьць торфаздабычы.

Другімі галоўнымі прычынамі цяжкасьці работы тарфянога сэктару былі недапушчальныя адносіны з боку раённых арганізацый (РВК, Райкалгассаюзаў) да справы торфаздабычы.

Снабжэньне нашых торфараспрацовак прадуктамі, ня гледзячы на тое, што гэтыя прадукты былі нам занаражаны, з боку Белкаапсаюзу, і паасобных Райпо было самае злачыннае. Часта арцелі не атрымлівалі зусім прадуктаў, альбо атрымлівалі іх з недапушчальнымі перабоямі і ў паменшанай колькасьці.

Вось чаму выкананьне пляну ў першую палову сэзону было недапушчальна нізкім. За май месяц было выканана ўсяго 4 проц. сэзоннага заданьня.

Пералом у рабоце наступіў выключна дзякуючы грамадзкай думцы, якая была складзена вакол пытаньня торфу, дзякуючы катэгарычным пастановам аб торфаздабычы партыі і савецкай улады.

І толькі пры такім становішчы на 20 ліпеня мы змаглі дабіцца выкананьня сэзоннага пляну ўсяго толькі (па ня поўным даным) на 58 проц.

Пэрспэктывы разьвіцьця тарфяной справы у сыстэме прамысловай каапэрацыі вялізарныя. Дзяржаўная тарфяная прамысловасьць ня можа ахапіць поўнасьцю ўсёй торфаздабычы і ёй на дапамогу, для снабжэньня палівам прамысловасьці і ўстаноў павінна прыйсьці тарфяная каапэрацыя.

Адбываючыйся ў сучасны момант у Менску 4 Усебеларускі Зьезд Прамкаапэрацыі павінен, па нашай думцы, з усёй рашучасьцю падкрэсьліць значэньне торфа ў сваёй сыстэме, рашуча трэбаваць у сваіх рэзалюцыях удзяленьня яму самай большай увагі, дабіцца перад адпаведнымі органамі бесперабойнага снабжэньня сваіх тарфяных арцеляў прадуктамі харчаваньня і поўнага забясьпечаньня арцеляў рабочай сілай.

Торфсэктар **Кучынскі, Кобазаў.**

Вучэцеся працаваць у рагачэўскіх тарфянікаў

Тарфяныя распрацоўкі Рагачэўскага раёну, ўваходзяць у аб'яднаньне Белпрамкаапэрацыі. За сэзон 1931 г. яны павінны былі здабыць торфу 6.200 тон. Калі-ж узяць пад увагу тое, што з раду прычын торфараспрацоўкі ў Рагачэўскім раёне пачаліся са спазьненьнем на ⅓ сэзону, дык ясна становіцца пагражаючае становішча з торфаздабычай. Але няма тых цяжкасьцяй, якія немагчыма ўзяць пры напружанай ўпартай, ўдарнай рабоце. Гэта добра ўсьвядомила сабе кіраўніцтва торфараспрацоўкамі Рагачэўскага раёну. І нічога дзіўнага, што ў выніку на торфараспрацоўках Рагачэўскага раёну, на 25-га ліпеня 1931 г. заданьне выканана на 117 проц.

Як-жа рагачэўскія тарфянікі дасягнулі такіх посьпехаў

З самага пачатку на ўсіх торфарас працоўках рабочым было добра растлумачана, на якой вышыні павінна стаяць справа торфаздабычы ў БССР. На ўсіх торфараспрацоўках зараз-жа былі ўстаноўлены прэміравальныя фонды, быў адшуканы ўвесь патрэбны інвэнтар для торфапрацы.

Рабочыя ўзьнялі хвалю ўдарнага руху, ўсюды былі створаны ўдарныя брыгады, паміж кожнай арцельлю былі заключаны сацыялістычныя ўмовы: на большую здабычу торфу, і належную якасьць яго. І дзякуючы ўдарнаму руху і сацыялістычнаму спаборніцтву, у Малашкоўскай арцелі, Курганскага сельсавету два ўдарнікі далі вы працоўку торфу па 14.000 цаглін ў дзень. У Стралкоўска-Сяміноўскай арцелі ўдарнікі таксама ўвесь час паказвалі прыклады ўзорнай працы па торфаздабычы.

За добрую ўдарную работу ўдарнік з Гарадзецкай арцелі тав. Надтачаеў прэміраваны. Прызначана прэміраваць старшыню Стралкоўска-Сяміноўскай арцелі т. Смалянчука, арцель якога выканала сваё заданьне на 200 пр., са Старамачалеўскай арцелі прэміруецца ўдарнік тав. Хаткевіч і інш. ўдарнікі з арцеляй раёну.

Гэтыя прэміі раздадзены таварышом не таму, што мо' каму так захацелася, а іменна таму, што дынаміка росту выкананьня пляну ішла ўвесь час бальшавіцкімі тэмпамі: на 1 чэрвеня 1931 г. сэзоннае заданьне было выканана толькі на 4 проценты, на 10 чэрвеня сэзоннае заданьне было ўжо выканана на 10 проц., на 20 чэрвеня выкананьне сэзоннага заданьня дасягнула 36 проц., на 1 ліпеня выкананьне сэзоннага заданьня—70, на 10-га ліпеня —92 проц. і на 25-га ліпеня выкананьне сэзоннага заданьня заблішчэла лічбай 117,—гэта значыць 117 проц. сэзоннага заданьня не дасягнуўшы яшчэ тэрміну заканчэньня самога сэзону.

І праў старэйшы раёны торфамайстар тав. **Чайкоўскі**, калі тлумачыць гэтыя дасягненьні тым, што ўвесь час Райторфкіраўніцтва трымала моцна кіраўніцтва ў руках шляхам амаль што дзённых выездаў на месца торфараспрацовак, шляхам ліквідацыі меўшыхся недахопаў на ходу, на месцы.

Трэба адзначыць, што такія посьпехі, такія лічбавыя паказьнікі па здабычы торфу дасягнуты бяз належнай ўвагі раённых устаноў. Некаторыя сельсаветы проста перашкаджалі ў працы, зьнімалі возчыкаў з торфагуж павінасьці і перастаўлялі іх на другую работу.

Каб ў раёне праходзілі торфараспрацоўкі пра належнай ўвазе з боку ўсіх арганізацый—гаворыць торфамайстар тав. Чайкоўскі—былі-б дасягнуты яшчэ большыя паказьнікі.

Вопыт працы рагачэўскіх тарфянікоў павінен быць прыкладам для ўсіх торфараспрацовак БССР.

АЛЕСІН.

Сталоўка павінна садзей нічаць у працы торфара бочых

Праца рабкопу торфазаводу «Чырвоны Сьцяг» яшчэ ня стала ў першых радох барацьбітоў за выкананьне торфапрамлянаў.

Часта бываюць выпадкі, калі з рабкопу прывозяць зусім сьмярдзючае мяса, няпрыгоднае для ўжываньня.

Лядоўні для карыстаньня ня зусім прыгодны, а сроднаў патрачана многа.

Амаль такое-ж становішча з мясны мі складамі. Склады кругом цякуць. У выніку гэтых нядбайных адносін сапсулася 210 кгр. мяса.

Аб гэтым ужо ня раз пісаў наш цэнтральны друк, але сыгналы друку яшчэ не пачуты. Яны праходзяць міма вушэй бюракратычнага кіраўніцтва рабкопу заводу.

Брыгада: **Янцэвіч, Ладуцька.**

СЁНЬНЯ ПАЧЫНАЕЦЦА

пятнаццацідзёньнік праверкі падрыхтаванасьці да хлебазагатовак

У Аршанскім раёне яшчэ не прыступілі да рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) ад 15 ліпеня

Новы хлеб спаткаць у поўнай гатоўнасьці

Зьнішчыць самацёк на Аршаншчыне

ВОРША. (Наш. кар.). Да збожжазагатовак засталося ўжо зусім мала часу. Ня гледзячы на гэта на Аршаншчыне да гэтай важнай гаспадарча-палітычнай кампаніі амаль ніхто ня рыхтуецца. Тут панае поўны самацёк. Нават Райгандаль, які павінен зьяўляцца кіраўніком і кантролем у справе падрыхтоўкі да збожжазагатовак, падштурхваць адстаўшых, нічога канкрэтнага не зрабіў у справе падрыхтоўкі да загатовак. Ён чакае плянавых заданьняў ад Наркамснабу, у той час, як рыхтавацца да збожжазагатовак можна і не чакаючы плянаў. Райгандаль ня прымае ніякіх мер і ў адносінах да тых, хто зусім бязьдзейнічае ў справе загатовак.

„Мы ня ведаем сваёй ролі ў збожжазагатоўках“

Так разважае старшыня Аршанскага райспажыўтаварыства. А між тым райспажыўсаюз у гэтым годзе будзе зьяўляцца асноўным загатоўцам. Такавы дырэктывы партыі і ўраду; аб гэтым ужо ведаюць кожны рабочы, калгасьнік і толькі старшыня райспажыўсаюзу нічога ня хоча ведаць, чакаючы дырэктыў зьверху.

Да гэтага часу райспажыўсаюз яшчэ не даў паказаньняў сваёй нізавой сеткі—сельспажыўтаварыствам рыхтавацца да збожжазагатовак. Ён зусім не клапоціцца аб кадрах, аб тары, якой зусім ня мае і ня рыхтуе складачных памяшканьняў.

Мала таго, райспажыўсаюз нічога не зрабіў у адносінах да абслугоўваньня хлебаўборачнай кампаніі грамадзкім харчаваньнем, а таксама ня прымае мер і па завозе прамтавараў да збожжазагатовак.

Райкалгассаюз чакае дырэктыў

Пераважную колькасьць таварнага збожжа ў гэтым годзе дадуць калгасы, бо Аршанскі раён ужо калектывізаван на 58 проц. Вось тое, што хлеб дадуць галоўным чынным калгасы, супакойвае загатоўчыя арганізацыі і стварае ў іх благадушны настрой і стаўку на самацёк. Яны лічаць, што калгасы і без падрыхтоўкі здадуць свае лішкі збожжа дзяржаве, а таму нечага вельмі і клапаціцца. Аднак, яны забываюцца, што склады, тару, кадры, транспартныя сродкі рыхтаваць ўсёроўна патрэбна, хоць збожжа будуць здаваць калгасы.

Райкалгассаюз зусім забыўся аб тым, што калгасьнікаў трэба падрыхтаваць да збожжазагатовак, што трэба павесьці сярод іх масавую растлумачальную работу, што трэба мабілізаваць грамадзкую думку на хутчэйшы абмалот збожжа і хутчэйшую здачу лішкаў яго дзяржаве, арганізаваць падвозку збожжа на ссыпныя пункты і г. д.

Кулацтва ужо зараз пачынае разьвіваць шалёную агітацыю супроць збожжазагатовак, каб сарваць іх. Гэтай кулацкай агітацыі не даецца ніякага адпору. Райкалгасаюз, замест разгортваньня падрыхтоўкі да збожжазагатовак, маўчыць і чакае дырэктыў.

— Калгасы ўсё роўна здадуць дзяржаве збожжа, кажа старшыня райкалгасаюзу т. Масалкоў,—як толькі мы атрымаем дырэктывы зьверху, зараз-жа распачнем збожжазагатоўкі.

Тэхнічная база яшчэ не гатова

Цэнтральным пунктам збожжазагатоўчай кампаніі гэтага году зьяўляецца падрыхтоўка — зерняхавальнікаў, элеватараў, тары і чыгуначнага транспарту. На Аршанчыне і тут яшчэ ня ўсё добра. Элеватар з яго складамі яшчэ не гатоў, рамонт выканан толькі на 85 проц. Тары не хапае вельмі многа: патрэбна да 60.000 мяхоў, а маецца якіх-небудзь толькі 12.000. Месячнік па зборы тары прайшоў зусім нездавальняюча і зараз збор тары ідзе вельмі марудна.

Для збожжазагатовак не хапае патрэбных кадраў-прыёмшчыкаў, рахунковых работнікаў і г. д.; ніхто ня дбае аб гэтым.

Нічога яшчэ ня зроблена ў справе арганізацыі падвозкі збожжа на цэнтральныя склады, ды і склады гэтыя яшчэ не гатовы.

Чыгуначны вузел Ворша таксама яшчэ не гатовы да прыёмкі новага хлеба. Яго пакгаўзы і склады заняты рознымі грузамі, якія ніякіх адносін не маюць да чыгункі. Кліенты гэтых грузаў не забіраюць і не аслабаняюць складаў.

Саюзхлеб спадзяецца, што ўсё будзе добра

Хоць як-небудзь, але рыхтуецца да збожжазагатовак аршанскае аддзяленьне Саюзхлеба. Яно ў асноўным падрыхтавала ўжо свае склады да прыёмкі збожжа, але... і тут ёсьць перашкода. У Саюзхлеба няма тары, не хапае кадраў, гэтымі пытаньнямі зараз ніхто ў Саюзхлебе не займаецца. Наадварот работнікі Саюзхлеба і яго Аршанскай канторы разважаюць так:

— Абы толькі пачаліся збожжазагатоўкі, да таго часу ў нас будзе ўсё гатова. Збожжа мы прымем.

Трэба памятаць і пра аднаасобніка

41 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак Аршчаншчыны яшчэ паза калгасамі, а гэта значыць, што трэба падрыхтавацца да збожжазагатовак і ў аднаасобным сэктары. Аднак пакуль што яго тут абыходзяць моўчкі. Праўда кулацка-заможным гаспадаркам яшчэ з вясны далі цьвёрдыя заданьні выходзячы з заданьняў па сяўбе, але трэба сказаць, што гэтыя заданьні вельмі нізкія, бо добры ўраджай дае магчымасьць узяць у кулака і заможніка больш збожжа, чым мяркавалася раней. Звыш гэтага ёсьць яшчэ многа заможных гаспадарак, якім не дана цьвёрдых заданьняў. Аб гэтым трэба паклапаціцца зараз-жа, каб хлеб не папаў на прыватны рынак.

У такім стане зараз знаходзіцца падрыхтоўка да збожжазагатовак на Аршаншчыне. Гэта прымушае патрабаваць ад усіх гаспадарчых, савецкіх, калгасна-каапэрацыйных і прафсаюзных арганізацый і партыйных ячэек зараз-жа распачаць падрыхтоўку, каб новы хлеб спаткаць у поўнай гатоўнасьці.

Па ўсіх праявах апартуністычнай стаўкі на самацёк трэба моцна ўдарыць.

А. К-рын.

„Савецкая Беларусь“ уключаецца ў пятнаццацідзеньнік

«ЦК УсеКП(б) зварочае ўвагу ўсіх партыйных арганізацый на выключную важнасьць пасьпяховага правядзеньня хлебазагатовак у гэтым годзе як у сацыялістычным, так і індывідуальным сэктарах сельскай гаспадаркі. Рашаючыя перамогі калектывізацыі, рост саўгасаў і МТС, высокі процант таварнай прадукцыі ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі ствараюць усе магчымасьці для хуткага выкананьня пляну хлебазагатовак і адна часовага вывазу хлеба да прыстанцыйных пунктаў і элеват

Да 1 жніўня рэалізаваць пазыку ў вёсцы

Рэалізацыя пазыкі ў вёсцы,

асабліва па аднаасобным сэктары, зрываецца

Шэфы! камсамольцы! калгасьнікі! Бярэце на буксір адстаючыя раёны і сельсаветы, дапамажэце рэалізаваць пазыку ў найкарацейшы тэрмін.

Трэці тыраж пазыкі „Пяцігодка— за чатыры гады"

Бяспроцантна-выйгрышны выпуск

ЧАЛЯБІНСК. На вячэрнім пасяджэньні 25 ліпеня і раніцнім пасяджэньні 26-га выйгрышы па 200 руб. па бяспроцантна-выйгрышнаму выпуску прыпалі на наступныя нумары сэрый (на ўсіх 10 аблігацыях):

00566, 03643, 04703, 05929, 06619, 06967, 07031, 07945, 08345, 08903, 09369, 10101, 10674, 11287, 13350, 14057, 14124, 14924, 14944, 15141, 16336, 16088, 16558, 16597, 16808, 17234, 17856, 18121, 18559, 18718, 18749, 22758 *) 23222, 23821, 24167 **), 24182, 24797, 25160, 28152, 28662, 30 083, 33457, 35940, 36648, 37160, 38012, 40463, 40520, 41812 42345, 43179, 44018, 44134, 44335, 45336, 45362, 45631, 45794, 46083, 46525, 47220, 47399, 48296, 50527, 51383, 51824, 53298, 54633, 54848, 55881, 55979, 56353, 56692, 57483, 58019, 59677, 60480, 60733, 60746, 61364, 62376, 63687, 64738, 64783 *) 65112, 65396 **), 65587, 66731, 67471, 67981, 68538, 69093, 69154, 70081, 71635, **), 74160, 74616, 74824, 76158, 79030, 80003, 81549, 81672, 82579, 83383, 83712, 84183, 84956, 85205, 86402, 86708, 87625, 88253, 89057, 89213, 89621, 90392, 90480 *), 90743, 92003, 92956, 93110 **), 93722, 95327, 97390, 97609, 98146, 98447, 98148, 99036.

Выйгрышы па 1 000 руб. прыпалі на наступныя нумары сэрый і аблігацый: №№ сэрыі 001946 аблігацыі 08, 023591 абл. 03, 051879 09, 023591—03.

*) Толькі для аблігацыі 3 пазыкі індустрыялізацыі.

**) Толькі для аблігацыі „Пяцігодка— за 4 гады".

Аднаасобны сэктар адстае

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Кантрольныя лічбы па рэалізацыі пазыкі «Трэці рашаючы год пяцігодкі» ў горадзе на 25 ліпеня выкананы на 106,3 проц., а па вёсцы—на 66 проц. Ня гледзячы на тое, што па горадзе мы маем перавыкананьне кантрольнай лічбы, усё-ж становішча з рэалізацыяй пазыкі на радзе прадпрыемстваў і заводаў на некаторых буйнейшых зьяўляецца зусім нездавальняючым: падпіскай ахоплены ня ўсе 100 проц. рабочых і служачых і не на поўны ў месячны аклад. Вось прыклады: на фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі» з 3348 рабочых пры месячным заробку ў 329.000 р. падпісалася на пазыку 3035 на суму 277.125 руб. Завод «Чырвоны мэтазіст», дзе працуе 1110 чал. падпісалася 994 чал. на суму 87.695 р. пры месячным заробку ў 135.000 руб. На фабрыцы «Дзьвіна» з 2193 рабочых ахоплены падпіскай 1822 на 75.065 р. пры месячнай зарплаце ў 114.141 р. Панчошная фабрыка пры месячнай зарплаце ў 183.500 р. дала падпіску толькі на 136.405 р., з 3415 рабочых ахоплены падпіскай 2830. Зусім ганебнае зьявішча існуе на біофабрыцы, дзе з 57 рабочых з месячнай зарплатай у 5460 руб. падпісалася на пазыку 55 і на агульную суму 1350 руб. Гэтыя факты кажуць аб тым, што партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі і камісіі садзейнічаньня не разгарнулі належнай растлумачальнай работы на 100 проц. ахоп усіх рабочых пазыкай і ня менш месячнага заробку.

Зусім нездавальняючае становішча з рэалізацыяй пазыкі мы маем на вёсцы, дзе шэраг сельсаветаў ганебна адстае і асабліва па рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў. Напрыклад: **Рудзінскі** сельсавет павінен быў рэалізаваць сярод аднаасобнікаў пазыку на 10.600 руб., а на 25 ліпеня рэалізавана—на... 120 руб. **Нараўлянскі** сельсавет, які павінен быў рэалізаваць аблігацый сярод аднаасобнікаў на 5515 р., нічога не рэалізаваў. **Бабініцкі** сельсавет замест рэалізацыі на 6480 р. рэалізаваў на 15 руб. **Селюцкі** сельсавет рэалізаваў на 500 р. сярод аднаасобнікаў замест прадугледжаных 8805 руб. **Рудакоўскі** сельсавет з 13680 р. рэалізаваў на 920 р., **Старасельскі** з 5920 р.—рэалізаваў на 185 р., **Едагінскі** замест 6975 р. рэалізаваў на 895 р., **Даўжанскі** сельсавет замест 4615 р., рэалізаваў 985 р., **Летчанскі** сельсавет замест 10665 р.—рэалізаваў 1895 р., **Міхалеўскі** сельсавет замест 11025 р.—рэалізаваў 10.000 р., **Шумянскі** сельсавет замест 4140 р. рэалізаваў на 950 руб.

Заданьне па рэалізацыі пазыкі па сацыялістычным сэктары па ўсіх сельсаветах амаль выканана за выключэньнем Старасельскага і Бабініцкага, а некаторыя сельсаветы па сацыялістычным сэктары перавыканалі заданьне. Напрыклад: **Даўжанскі** сельсавет 6750 р.—8195 р., **Міхалеўскі**—2770 р.—6000 р. **Віцебскі**—4500 р.—8000 р.

Усе гэтыя зьвесткі кажуць аб тым, што асабліва па індывідуальным сэктары мы маем вялізарны прарыў у галіне распаўсюджваньня пазыкі. Калі з агульнага заданьня ў 95.680 р. выканана толькі на 11.965 р. Гэта абавязвае нас павесьці вялікую растлумачальную работу і да 1-га жніўня дабіцца поўнага выкананьня і перавыкананьня заданьня, ахапіўшы падпіскай на пазыку ўсіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Н. Дварсон.

Ударнікі ашчаднай справы прэміраваны

Лепшым доказам, што плян мабілізацыі сродкаў зьяўляецца рэальным і што яго можна выканаць і перавыканаць зьяўляецца тое, што рад раёнаў перавыканалі свае заданьне.

Так, у галіне ашчаднасправы за 1-е паўгоддзьдзе 1931 г. **Крупскі** раён выканаў 100 проц. гадавога заданьня па разьвіцьці сеткі ашчаднкас і 104 проц. гадавога заданьня па фізычных укладах; **Старобінскі** раён выканаў 100 пр. гадавога заданьня па сетцы і 58 пр. гадавога заданьня па фізычных укладах; **Пухавіцкі** раён выканаў 83 проц. гадавога заданьня па сетцы і 72 проц. па фізычных укладах.

За лепшую работу па выкананьні кантрольнай лічбы па фізычных укладах і разьвіцьцю сеткі ашчадкасы Цэнтральная Камісія Садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе пры ЦВК БССР гэтыя раёны прэміраваны.

Пастановай Цэнтральнай камісіі так сама прэміраваны наступныя таварышы: рабочыя заводу «Варашылава т. т. **Эстэркін** (адказны рэдактар шматтыражкі), **Фрумкін, Казакевіч і Іванавіч** па 50 руб. за актыўную работу па разгортваньні ашчадсправы на заводзе і вярбоўку ўкладчыкаў.

Працаўнікі ашчадкасы па сумяшчэньні пры 38 кав. палку тав. **Лукашэвіч** прэміруецца ў суме 75 руб. і тав. **Кошар** у суме 50 руб. за пасьпяховую работу ў выніку якой ўцягнута значная сума стабільных укладаў, таксама прэміраваны тав. **Сулерцін** працаўнік ашчадкасы пры 37 арт. дывізіі, у 75 руб. за ўзорную пастаноўку агітмасавай работы, моткае абслугоўваньне кліентуры і 100 проц. ахват дзяржпазыкай.

Член рабочкому саўгасу «МОПР» Віцебскага раёну тав. **Сямёнаў** прэміраваны ў суме 100 руб. за ўцягненьне звыш 8.000 руб. фізычных укладаў і правядзеньне тыражоў агіт-масавай вярбовачнай работы.

Упаўнаважаны нізавой ашчадкасы Брагінскага раёну тав. **Коцуба** прэміраваны ў 50 руб. за выкананьне на 125 проц. заданьня па рэалізацыі пазыкі.

Інспэктар Гомельскай гарашчадкасы тав. **Равіч** прэміраваны ў 150 руб. за актыўны ўдзел у правядзеньні дзяднага штурму, даўшага значны прыліў укладаў.

Працаўнік сельскай ашчадкасы Быхаўскага раёну тав. **Буланькоў** прэміраваны ў 60 руб. за пасьпяховую работу і выкананьне заданьня па ашчад касе.

Работа гэтых раёнаў і таварышоў павінна зьявіцца лепшым прыкладам для астатніх.

Ш-іч.

Апартуністычны самацёк зрывае падпіску

Магілеў. (Наш кар.). Тэмпы работы ў рэалізацыі пазыкі па Магілеўскім раёне ўсё яшчэ неданучальна слабыя. Заданьне па рэалізацыі пазыкі сярод неарганізаванага насельніцтва выканана ўсяго на 61 проц. Яшчэ агіднейшае становішча па рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнага сэктару. Калі па калгасах плян выканан на 126 проц., то па аднаасобным сэктары ўсяго... на 12,8 проц.

Нявольніцкія тэмпы, бязьдзейнасьць, апартуністычная стаўка на самацёк фінансавых арганізацый, камсамолу, раду сельсаветаў, партячэек, шэфскіх арганізацый—вось прычыны гэтых ганебных лічбаў.

Недапушчальным фактам зьяўляецца тое, што ніводная з раённых арганізацый ня выканала пастановы РК КП(б)Б аб пасылцы раённага актыву ў сельсаветы па правядзеньні рэалізацыі пазыкі. Напрыклад, камсамол павінен быў паслаць 90 чалавек, паслаў усяго 30 і то толькі на 3 дні.

Разам з сельсаветамі Хрыплеўскім, Вендараскім, Бялевіцкім, якія своечасова ўключыліся ў правядзімы месячнік штурмавы дэкаднік, здолелі па-баявому мабілізаваць калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы, дзякуючы чаму заданьне перавыканалі. Мы маем і такія сельсаветы, якія паказваюць рэкорд бязьдзейнасьці ў гэтай справе. Напрыклад, Бракаўскі сельсавет заданьне выканаў ўсяго на... 0,9 проц., Гарадзішчанскі—на 9,6, Шчэжарскі—6,5, Машанацкі—4,6 проц., Палыкаўскі—3,9 проц. і інш.

Маюцца і такія агідныя факты. У Грыбінеўскім сельсавеце дырэктывы і аблігацыі ляжаць пад замком. Сельсавет справай рэалізацыі пазыкі амаль зусім не займаўся. А старшыня Хонаўскага сельсавету прыехаўшую брыгаду рабочых-ударнікаў сустрэў так: «убірайцеся вы адгэтуль, мы зараз заняты другой справай, няма чаго лезьці з пазыкай».

Ня гледзячы на тое, што ў асноўным па гораду Магілеву заданьне выканана на 113 проц., але ўсё-ж такі мы маем вялізарны прарыў па ахопу падпіскай рабочых і служачых. Да гэтага часу не ахоплена падпіскай 4.000 чалавек. Маюцца паасобныя прадпрыемствы, якія ўсё яшчэ ганебна адстаюць: швейная, якая не ахапіла звыш 1.000 рабочых, торфазавод, падпіска якога складае ўсяго 25 проц. і інш.

Вось галюцэя абуральных фактаў бязьдзейнасьці, няўменьня працаваць раду партячэек, ФЗМК, сельсаветаў і фінансавых арганізацый. Так далей працягвацца не павінна. РК КП(б)Б павінен прыняць рашучыя меры.

С.

Брыгада НКФ сігналізуе

17 сельсаветаў не жадаюць атрымаць аблігацый з банку на 100.000 р.

Прэміяльны фонд ляжыць не кранутым

У Крупскім раёне кампанія па рэалізацыі пазыкі на вёсцы праходзіць дрэнна. Гэту работу пачалі толькі праводзіць арганізаваныя і пасланыя ва ўсе сельсаветы брыгады ў колькасьці 43 чал. З гэтых брыгад 18 камсамольцаў ня могуць быць добра скарыстаны па рэалізацыі пазыкі на вёсцы таму, што аблігацыі на суму ў 100.000 руб. ляжаць у Банку, а 17 сельсаветаў іх дагэтуль ня маюць і не жадаюць атрымаць.

Сувязі з паехаўшымі няма і ад іх таксама вестак не паступае. Апошніх вестак аб ходзе падпіскі раённае кіраўніцтва ня мае. Старшыня райкамсоду **Ласавак** нічога ня робіць, таксама як і ўся раённая камісія садзейнічаньня, знаходзячы здавальненьне ў мерапрыемствах іншых арганізацый.

Сэзонныя рабочыя на лёнаазводзе падпіскай не ахоплены. Фонд прэміяльны ляжыць у ашчадкасе некранутым і ніхто аб ім нават ня ведае.

Брыгада НКФ, Электразаводу і «Сав. Бел.»: Стратановіч, Шырман.

ПЛЯН ПЕРАВЫКАНАЛІ

(Бярэзінскі раён)

Своечасова рэалізацыя акцый Трактарацэнтру мае вялізарнае значэньне ў справе разгорнутага будаўніцтва новых МТС—вагароў сацыялістычнага земляробства і калектывізацыі вёскі.

Высокагорскаму сельсавету патрэбна было ў другім квартале распаўсюдзіць акцый на 950 руб. Каб выканаць заданьне сельсавет мабілізаваў грамадзкую думку насельніцтва вакол гэтага пытаньня. Былі арганізаваны суботнікі па вывазу лесаматар'ялаў з адлічэньнем заробленых грошай на набыцьцё акцый. Праведзены растлумачальныя сходы на вёсках. Дзякуючы гэтаму, замест 950 руб., рэалізавана акцый на 1.424 руб.

Сымон Ракіта.

Рэчыцкі райвыканком і гарсавет

ня цікавяцца школьным будаўніцтвам

На фронце падрыхтоўкі да навучальнага году Рэчыцкі раён мае некаторыя дасягненьні. Своечасова праведзены пераніс дзяцей і ўсе яны прымацаваны да школ. Ударна праводзіцца работа па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў 1909 г. нараджэньня.

Мае Рэчыцкі раён і шмат прарываў. Так, на фабрыцы «Х кастрычнік» ёсьць шмат няпісьменных рабочых, але фабком нічога ня робіць, каб ахапіць іх навучаньнем. Пагражаючае становішча з будаўніцтвам школ. У раёне будуецца 13 новых школ, але будаўніцтва з-за недахопу будаўнічых матар'ялаў (гал. чынам, цэглы) зрываецца. Між тым, цэглы ў раёне шмат, але яна аддана для будаўніцтва банку, і яе невядома калі яшчэ будзе будавацца.

Ні РВК, ні гарсавет школьнаму будаўніцтву не дапамагаюць. Заключаны дагавор паміж РВК і леспрамгасам аб забясьпячэньні майстэрняў лесаматар'ялам для вырабу абсталяваньня для школ, не выконваецца. Лес, прызначаны для абсталяваньня школ, нават яшчэ ня рэзаўся.

Усе гэтыя і шмат іншых прарываў кажуць аб тым, што ўсім раённым і гарадзкім установам і арганізацыям трэба па ўдарнаму ўзяцца за ліквідацыю маючыхся прарываў, каб сустрэць новы навучальны год падрыхтаванымі.

Барэйка Б.

Як веравайшанцы змагаюцца за суцэльную калектывізацыю

Пад божам у самай Воршы раскінуліся палі Веравайшанскага сельсавету. Асяродак яго—вёска Забалоцьце—знаходзіцца ў 8 кілёмэтрах ад гораду. Калісьці тут да рэвалюцыі на тэрыторыі Веравайшанскага с-с знаходзілася тры маёнткі—Хамінічы, Васкоўшчына, Хорабрава. Амаль усю плошчу пахаці Веравайшанскага сельсавету, лепшую плошчу, займалі маёнткі; з агульнай плошчы пахаці па сельсавету ў 4.185 га, абшарнікі карысталіся 1.357 га ня лічачы таго, што ў іх было пад лесам, лугам і т. д. Беднята і сераднякі і зараз яшчэ ня могуць забыцца на тое, як цягнулі з іх духі гэтыя «жыватдзёры»-абшарнікі.

Кастрычніцкая рэвалюцыя пазбавіла веравайшанцаў ад абшарнікаў і зараз сялянства пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі закончваюць суцэльную калектывізацыю свайго сельсавету, перабудоўваюць жыцьцё сваё на новаму, па калгаснаму. Зараз замест

Старшыня Веравайшанскага с.с. Буйніцкі.

абшорніцкіх маёнткаў, замест панскіх палёў—па Веравайшанскім сельсавеце квітнеюць калгасныя палі.

Па Веравайшанскім сельсавеце зараз налічваецца 10 калгасаў: «Перамога», «Сталінская Веравойша», «Парыская камуна», «Чырвоная горка», «Сьцяг суцэльнай калектывізацыі», «Чырвоны партызан», «Чырвоны чыгуначнік», «Зарэ», «Бедняцкі шлях» і калгас імя XVI партзьезду. З агульнага ліку **444 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па сельсавеце ў калгасах 438.** Толькі шэсьць яшчэ гаспадарак застаюцца па за калгасамі, але зусім недалёк той час, калі і гэтыя гаспадаркі далучацца да калгасаў.

Як-жа дабіліся веравайшанцы таго, што іх сельсавет зараз ужо заканчвае суцэльную калектывізацыю і чаму Веравайшанскі сельсавет ідзе ў справе калектывізацыі ўпярэдзе ўсіх сельсаветаў Аршанскага раёну? Ня лёгка далася гэта перамога веравайшанцам, але па бальшавіцку змагаючыся з кулаком і яго агентурай правымі і «левымі» апартуністамі, змагаючыся з цяжкасьцямі, навісшымі праводзячы ў жыцьцё Ленінскую палітыку дабраахвотнасьці, шляхам шырокага разгортваньня масавай растлумачальнай работы сярод бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, партыйная ячэйка Веравайшанскага сельсавету, абапіраючыся на ўвесь вясковы актыў, з дапамогай шэфаў-рабочых Аршанскага чыгуначнага вузла, дабіліся перамогі.

Усе сілы на перабудову вёскі

Былі цяжкасьці. Вось у партыйнай ячэйцы Веравайшанскага с-с увесь час ня гладзіцца з кіраўніцтвам. Адзін сакратар ячэйкі быў зьняты райкомам партыі за бязьдзейнасьць, а новы—спужаўшыся цяжкасьцяй з работы ўсім уцёк. Аднак ня гледзячы на гэта, усе партыйцы, поруч цяжкасьцямі не адступалі і крок за крокам, згуртаваў шы вакол сябе рабочы, калгасны і вясковы актыў, праводзілі наступную работу па ліквідацыі вёскі, мабілізаваўшы на гэта ўсё сілы, ня гледзячы на перашкоды кулакоў і падкулачнікаў.

Асобныя партыйцы — **Шандалесаў Буйніцкі і Жагула** яшчэ ў 1929 годзе пачалі перабудову Веравайшанчыны з аднагасобнай, былой абшарніцкай—у калгасную. Шандалесаў, рабочы саўгасу, быў вылучаны на пасаду дырэктара сьвінагадоўчага саўгасу «Вусьце» і работу па калектывізацыі, праводзілі і праводзяць: Буйніцкі—старшыня сельсавета, была рабочы чыгуначнік Аршанскага вузла, сын рабочага заводу «Чырвоны Кастрычнік» і—Жагула—сакратар сельсавету.

Ініцыятыўныя групы і вярбовачныя брыгады—застрэльшчыкі калектывізацыі

Па ўсім сельсавеце было арганізавана 8 ініцыятыўных груп, якія ўсе перарасьлі ў калгасы. У існуючых калгасах былі створаны вярбовачныя брыгады, якія вербавалі новых калгасьнікаў. Гэтыя ініцыятыўныя групы і вярбовачныя брыгады, не баючыся пагроз кулакоў і падкулачнікаў і іх агітацыі, шырока растлумачвалі бядняцка-серадняцкім масам аднаасобнікаў перавагі калектыўнага гаспадараньня перад аднаасобным.

Групы праводзячы спрэзадачы існуючых калгасаў перад аднаасобнікамі, дэманструючы дасягненьні, пасьпяхова вербавалі калгасьнікаў, будавалі новую вёску.

Трэба адзначыць, што ініцыятыўныя групы праводзілі сваю работу на аснове шырокай масавай растлумачальнай работы сярод бядняцка-серадняцкіх мас, цесна ўвязваючы калектывізацыю з усімі гаспадарчымі і палітычнымі кампаніямі на вёсцы, шырока пагулярызуючы важнейшыя рашэньні партыі і ўраду ў масах.

С-г. выстаўка зрабіла першы зрух

— «Першы калгас,—расказвае тав. Буйніцкі,—быў арганізаваны ў нашым сельсавеце яшчэ ў 1929 годзе, у в. Пузырова. Гэта было як раз у дзень уражаю. У саўгасе «Забалоцьце» была сельска-гаспадарчая выстаўка.

Тут мы пабачылі сталых коняй-трактары і іншыя сельска-гаспадарчыя машыны, якія маюцца ў калгасах, пабачылі і калгасныя дасягненьні нагогул у сельскай гаспадарцы. Вось тут я і іншыя сяляне ўпэўніліся, што выбіцца з вечнай галечы можна толькі праз калгас. У той-жа дзень пасьля выстаўкі ў в. Пузырова быў арганізаваны калгас з 24 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Арганізатарамі гэтага калгасу былі я, Шандалесаў і Жагула.

— Калгас адразу добра ўзяўся за работу і паказваючы яго дасягненьні, мы ўжо пазвалі наступ на вясковую цёмру, галечу, за калектывізацыю».

— «Даставалася ад кулакоў і падкулачнікаў нам добра,—расказвае далей т. Буйніцкі.—Усе спосабы яны скарыстоўвалі, абы толькі затрымаць калектывізацыю, але мы на гэта не гляделі і даючы добры адпор кулацтву, працягвалі работу.

— Мінулы год у в Туравічы, калі мы праводзілі там сход па калектывізацыі і паказвалі на жыцьцё камуны імя 10-годзьдзя Кастрычнікавай Рэвалюцыі, якая знаходзіцца недалёка ад гэтай вёскі, кулакі Пахамовіч, Карабіцкі і Баханы ўвесь час агітавалі супроць калгасу. «Там у камуне усе пазабіралі, а зараз кормяць тухлай рыбай, што вы хочаце зрабіць, каб і мы падохлі з голаду»,—крычалі яны, а пасьля, сарваўшы сход, бяжалі мне і Шандалесаву даць крымінальную справу, абвінаваціць у прымусовай арганізацыі, калгасу, але беднота зразумела «куды яе вядуць кулакі і які шлях паказваем ей мы і дзякуючы гэтаму мы пазбавіліся ад суду».

І гэта шчырая праўда. Пакуль усе вывалася, Крымінальны вышук доўга вёў справу, і Буйніцкаму і Шандалесаву часта прыходзілася адрывацца ад практычнай работы і зьяўляцца ў крымвышук для допытаў. На сьледзтве выявілася, што нікога і ніколі Буйніцкі з Шандалесавым у калгасы прымусова не заганялі, але кулакам адпор давалі добры.

— Амаль у кожнай вёсцы прыходзілася мець справу з адкрытымі выступленьнямі кулакоў і заможнікаў.

У в. Горная Веравойша, кулакі Шчэрба, Нікіпар, Навумаў і арандатар Котаў, калі Буйніцкі прышоў праводзіць сход па калектывізацыі, падбухторвалі беднату на сходзе:

— «Буйніцкі чалавек свой, давайце прагонім яго і ня будзе ў нас калгасу, бо калгасаў больш нідзе няма, як толькі ў іншым сельсавеце».

Кулаком не ўдалося. Беднята за імі не пайшла. Шэсьць бядняцкіх гаспадарак тут арганізаваліся ў ініцыятыўную групу, якая пасьля вырасла ў калгас з 38 бядняцка-серадняцкіх двароў.

Значна перашкаджала ў пасьпяховым разгортваньні калектывізацыі па Веравайшанскім сельсавеце і тое, што некаторыя сельсаветы Аршанскага раёну, як напрыклад Бразьдзечынскі, Панізоўскі, Крапівенскі і іншыя ў справе калектывізацыі адставалі.

Вярбоўка ў калгас

Ініцыятыўныя групы і вярбовачныя брыгады праробілі вялізарнейшую работу ў справе калектывізацыі. Удзельнікаў гэтых груп і брыгад можна назваць сапраўднымі змагарамі за новую калгасную вёску. Яны хадзілі па хатах аднаасобнікаў і вярбавалі іх у калгасы.

Яны штодзённа, кожную гадзіну, кожную хвілину праводзілі растлумачальную работу сярод бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў, актыўна і пасьпяхова змагаючыся з кулаком і яго агентурай.

Вярбовачная група ў калгасе «Сталінская Веравойша», у склад якой уваходзілі **калгасьнікі Мядзьвецкі Павел, Халімановіч Панцялей, Шчарбакоў Дзямід, Буйніцкі Янка, Гурская Хіма і Уланаў Трыфон** сваёй пасьпяшнай работай дамаглася таго, што іх калгас вырас з 14-ці да 69 гаспадарак.

Халімановіч Панцялей цяперашні сакратар праўленьня калгасу, самы актыўны вярбоўшчык калгасьнікаў, расказвае гісторыю свайго калгасу:

— «Аб арганізацыі ў калгас мы павялі гутаркі яшчэ гады тры таму назад і сем гаспадарак нашага пасёлку «Чырвоная ніва», у тым ліку і я парэшты было арганізавацца ў калгас, але яго не вацьцердзілі як вельмі маленькі. Больш ніхто тады яшчэ не жадаў разам з намі ісьці ў калгас. Так мы і заставаліся ініцыятыўнай групай да сакавіка мінулага году, калі ў нас ўжо арганізаваўся калгас з 28 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

— Да сьнежня месяца мінулага году мы ўвесь час праводзілі работу сярод аднаасобнікаў, каб яны далучыліся да нас, але тыя што вышлі з нашага калгасу ў студзені арганізавалі свой асобны калгас з 18 гаспадарак.

— Прайшла зіма і ў сакавіку гэтага году да нас далучылася 21 гаспадарка. Беднята і сераднякі ўбачылі, што мы жывём лепей чым яны на сваіх аднаасобных гаспадарак.

Зараз калгас «Сталінская Веравойша» замацоўвае дасягнутыя посьпехі. Ён пасьпяхова скончыў сяўбу ярыны, купіў на 400 руб. акцый Трактарацэнтру, падпісаўся на 1600 руб. на новую пазыку «Трэці рашаючы год пяцігодкі» і ўжо датэрмінова ўнёс 200 руб. сельска-гаспадарчага падатку за гэты год.

Так працавалі і вярбовачныя брыгады іншых калгасаў, змагаючыся з кулаком і падкулачнікам за новую калгасную вёску.

Вярбовачная брагада калгасу **«Чырвоны чыгуначнік»**, у окладзе калгасьнікаў—Грыднева Цімоха—рабочага чыгуначніка, дваццаціпяцітысячніка (старшыня калгасу) і калгасьнікаў—Варабьева Уладзіміра, Аўгусьціновіча Ільлі і Цэханскай—завярбавала 23 бядняцка-серадняцкіх аднаасобных гаспадарні ў калгас, дзякуючы чаму калгас іх вырас з 13 да 36 гаспадарак. А між тым была моцная агітацыя з боку кулакоў Машкоўскага — суседняга сельсавету супроць калектывізацыі. Гэтыя кулакі ў адзін голас крычалі, каб запужаць беднату:

— «Калгасы існуюць толькі да восені, а пасьля іх усе разгоняць. Ня ідзеце ў калгасы, калі жыць хочаце».

Вярбовачная брыгада калгасу «Парыская камуна», у склад якой уваходзілі **калгасьнікі Кузьняцова Караліна, Жагула** (сакратар сельсавету) і Бязьлодаў завярбавалі ў калгас 60 бядняцка-серадняцкіх двароў аднаасобнікаў і іх калгас вырас з 12 да 72 гаспадарак.

Так калгасьнікі Веравайшанскага сельсавета змагаліся за новы калгасны прыліў, так яны перабудоўвалі вёску на калгасны лад, ня гледзячы на шалёную агітацыю кулацтва супроць калектывізацыі. Але гаворачы аб гэтым змаганьні нельга яшчэ раз не адзначыць лепшага барацьбіта за калектыўную вёску—старшыня сельсавету тав. Буйніцкага. Ён паказваў прыклады большавіцкай работы, з упартасьцю вядучы індывідуальную агітацыю за новы прыліў у калгасы. Вось некалькі прыкладаў.

Аднаасобніца сераднячка з в. Ламачына, дзе ёсьць калгас «Парыская камуна»—**Кузьняцова Альжбэта** ўпарта не жадала ўступаць у калгас але, тав. Буйніцкі даказаў ей перавагу калгаснага жыцьця перад аднаасобным і дабіўся таго, што Кузьняцова ўступіла ў калгас.

Таксама т. Буйніцкі ўцягнуў у калгас і аднаасобніка з в. Ламачына Кузьняцова Адама, які доўгі час заставаўся па за калгасам.

Брыгада калгасьнікаў—ударнікаў калгасу, «Сталінская Веравойша», Веравайшанск с.-с Аршанскага раёну.

Такіх прыкладаў ёсьць па сельсавеце шмат.

Падштурхвалі і адстаючыя сельсаветы

Праводзячы калектывізацыю сваёй вёскі веравайшанцы не забываліся і аб тым, што трэба падштурхваць адстаючыя сельсаветы. Самым адсталым у справе калектывізацыі па Аршанскім раёне быў **Бразьдзечынскі сельсавет.** Ад яго не адставалі **Панізоўскі і Крапівенскі.** Яны ўвесь час цягнуліся ў абозе калектывізацыі раёну. Бачачы гэта партыйная ячэйка, сельсавет, настаўніцтва і ўвесь калгасны актыў зьвярнуліся да гэтых адсталых сельсаветаў з адозвай, у якой яны расказваючы аб мэтадах сваёй работы па калектывізацыі вёскі, па таварыску прысарамілі работнікаў адсталых сельсаветаў, патрабуючы бальшавіцкай работы.

Так веравайшанцы, змагаючыся з кулаком і яго агентурай правымі і «левымі» апартуністамі, праводзячы ў жыцьцё генэральную лінію партыі, пад яе кіраўніцтвам няўхільна ідуць па шляху паказаным Леніным да сацыялізму.

А. Мілашэўскі.

Рабочыя ст. Негарэлае ўключыліся ў барацьбу за своячасовае забесьпячэньне будаўнічымі матар'яламі Магнітабуду

НЕГАРЭЛАЕ, 29-VII. (БЕЛТА). Абмяркоўваючы адкрыты ліст рабочых домнянага цэху Магнітабуду да рабочых і служачых МБД чыгункі на хутчэйшае прасоўваньне грузаў і асабліва цэглы для Магнітабуду, таксама абмяркоўваючы выклік партсходу Менскага вузла на сацспаборніцтва па гэтым пытаньні, рабочыя і служачыя ст. Негарэлае на агульным сходзе прынялі выклік і абвясьцілі сябе мабілізаванымі на выкананьне паказаных у адозьве рабочых Магнітабуду задач.

З свайго боку рабочыя і служачыя ст. Негарэлае прынялі 11 пунктаў дагавору, па якіх будзе праходзіць спаборніцтва на хутчэйшае прасоўваньне грузаў Магнітабуду, выклікаўшы на сацспаборніцтва ст. Барысаў, Воршу, Смаленск і інш., праз якія будуць праходзіць грузы для магнітагорскага гіганту.

Арганізаваны тры кантрольныя пасты па службе цягі, эксплёатацыі і перагрузцы з лепшых ударнікаў-рабочых, якія будуць сачыць за выкананьнем узятых на сябе абавязкаў сацспаборніцтва і не дапускаць ніводнай хвіліны прастою вагонаў, якія адпраўляюцца ў адрас Магнітабуду.

Выканаць заданьне па распаўсюджваньні ЦО „Правды"

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Па горадзе Віцебску патрэбна распаўсюдзіць ЦО «Правда» 7.000 экз. Зараз тыраж газэты па горадзе складае яшчэ ўсяго 4.200 экз.

Улічваючы марудныя тэмпы з распаўсюджваньнем газэты «Праўда», гарком КП(б)Б абвясьціў бязьдзённік па распаўсюджваньні ЦО «Правда».

Н. Дварсон.

Двухдэкаднік трывогі. Другі этап культэстафэты

ЗАСТАЛОСЯ 32 ДНІ

ДА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ

Бабруйскі, Старадароскі, Заслаўскі і Рэчыцкі раёны яшчэ не разгарнулі падрыхтоўкі да новага навучальнага году

КОЖНЫ ДЗЕНЬ да пачатку заняткаў у школах ПАВІНЕН БЫЦЬ ШТУРМАМ па ліквідацыі прарываў у школьным будаўніцтве, рамонце, забесьпячэньні школ падручнікамі, праграмамі і палітэхнічным абсталяваньнем

Бязьлітасна біць па апартуністах, зрываючых нармальны пачатак работы ў школах

У Заслаўскім раёне пануе самацёк

На вовае школьнае будаўніцтва па Заслаўскім раёне адпушчана 252 200 р. Вызначана пабудаваць 10 аб'ектаў. З гэтых 10 будынкаў, па меркаваньні будаўнічай часткі РВК, ніводзін не будзе скончаны ў гэтым годзе. Тэхнік Заслаўскі так і кажа: **«перашкаджаюць аб'ектыўныя прычыны. Мы тут ні пры чым».**

Канчаткова закончанымі школамі лічацца толькі дзьве: Буцавіцкая і Рагачэўская, якія былі вызначаны па плану мінулага году. Але і ў Буцавіцкай школе яшчэ няма пячэй, няма цэглы, школа, няма інтэрнату для вучняў, няма студні.

З рамонтам старых школ відаць таксама вінаваты «аб'ектыўныя прычыны» і як вынік да рамонту яшчэ не прыступілі. Па школах няма нават каш тарысу патрэбнага рамонту. Ня вызначаны і грошы на гэту мэту, а яны ёсьць у сельсаветах. Тут ужо вельмі цяжка спасылацца на аб'ектыўныя прычыны, тым больш, што некаторыя школы сумелі ўласнымі сіламі правесьці рамонт (напрыклад, Вендзелеўская, Анусенскага сельсавету).

Будынкі яшчэ не рашаюць пытаньня падрыхтаванасьці да навучальнага году. Ня менш важную ролю адыгрываюць своечасовае набыцьцё абсталяваньня, а тут работы зусім няма. Кіраўнікі, партыі) доўжы паштэхнічнае абсталяваньне—усё гэта пытаньне далёкага будучага.

Як-жа рэагуе на гэта інспэктарыят асьветы?

Доўга прыйшлося-б чакаць адказу на гэтае пытаньне таму, што ўвесь інспэктарыят пайшоў у адпачынак, а прэзыдыум РВК не паклапаціўся вызначыць намесьніка.

Партыйна - камсамольская арганізацыя, РВК і сельсаветы павінны 30 дзён, якія засталіся да пачатку заняткаў, перагварыць у дні самаўдзнака бальшавіцкага штурму за поўнае выкананьне дырэктыў партыі аб усеагульным навучаньні, а героі «аб'ектыўных прычын» павінны атрымаць па заслугах.

Галінскі.

Настаўнікі абвясьцілі сябе мабілізаванымі

2-х дэкаднік трывогі па ліквідацыі прарываў у галіне культурнага будаўніцтва па Петрыкаўскім раёне распачаўся 20-га ліпеня. 23-га ліпеня была скліканая інструкцыйная нарада брыгадзіраў, якія выяжджаюць на сельсаветах. Усяго выехала на месцы 25 чалавек, **у большасьці настаўнікі, якія, ня гледзячы на час адпачынку, абвясьцілі сябе мабілізаванымі на час правядзеньня 2-х дэкаднікаў штурму.**

З. Зімніцкі.

Хойніцкі РВК „дапамог" школе

Усе былыя памешчыцкія, нэпманскія і кулацкія будынкі ў м. Хойніках заняты раённымі органамі пад канцылярыі, габінэты і кватэры служачых, а ШКМ, у якой ёсьць 10 груп, душыцца ў 4 клясных пакоях. Яшчэ горш справа з вучнёўскім інтэрнатам. Замест пашырэньня інтэрнату шляхам высяленьня з другой паловы будынку кватэруючых там савецкіх служачых, РВК перадаў райкалгасаюзу пад канцылярыю і тую частку будынку, што займаў інтэрнат. Дзе будзе інтэрнат у будучым навучальным годзе, ніхто ня ведае, нават сам РВК, бо другога будынку ў Хой

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
пра даклад Вышэйшага Савету Фізычнай Культуры БССР

1. Заслухаўшы даклад Вышэйшага Савету Фізычнай Культурхы БССР аб становішчы фізкультурнага руху ў БССР і выкананьні савецкімі і грамадзкімі арганізацыямі дырэктыў партыі і ўраду аб фізкультуры, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР канстатуе:

а) Мінулы год зьяўляецца пераломным у сэнсе росту палітычнай актыўнасьці фізкультурнікаў і падпарадкаваньня форм і зьместу фізкультурнай работы канкрэтным задачам разгорнутага сацыялістычнага наступленьня, што пацьвярджаецца практыкай ўдзелу фізкультурнікаў у правядзімых палітычных, гаспадарчых і культурных мерапрыемствах, у перавыбарчай кампаніі саветаў, асеньняй і вясновай сяўбы, калектывізацыі, ліквідацыі прарываў на прадпрыемствах, эстафэце працы і абароны і г. д.

Але ня гледзячы на гэта, агульнае становішча фізкультурнага руху ў БССР застаецца нездавальняючым і на паасобных яго вучастках маюцца прарывы, як-та: слабы тэмп перабудовы самадзейнага фізкультурнага руху па вытворчым прынцыпе; недастатковая яго масавасьць (зарадкавая гімнастыка; спартакіяды, масавыя гульні і г. д.), слабы ахоп усіх фізкультурнікаў грамадзка - палітычнай работай і нездавальняючае кіраўніцтва перабудовай фізкультурнага руху як па савецкай, так і прафсаюзнай лініі; зусім нездавальняючае становішча фізкультуры ў вёсцы, асабліва ў сацыялістычным сэктары; занадта марудная перабудова метадычнай і спартыўна-тэхнічнай работы, якая яшчэ недастаткова прыстасавана да канкрэтных задач працы і абароны (выкананьне прамфінплянаў, барацьба з прагуламі, зьнижэньне сабекошту, падняцьце якасьці працы, а таксама падрыхтоўка працоўных да здачы норм на значок «гатоў да працы і абароны»; наяўнасьць момантаў недацэнкі фізкультурнай работы з боку некаторых дзяржаўных і грамадзкіх арганізацый, недастатковая колькасьць інструктароў па фізкультуры, слабая спэцыяльная і палітычная падрыхтоўка іх, наяўнасьць сярод іх сацыяльна-варожых элемэнтаў.

2. Такое становішча фізкультурнага руху зьяўляецца вынікам таго, што ВСФК слаба кіраваў фізкультурхам, не скарыстаў узросшай актыўнасьці фізкультурных мас на выкананьне задач пастаўленых перад фізкультурным рухам у пэрыяд перабудовы яго, у адпаведнасьці з чарговымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва. ВСФК не ўстанавіў кантролю над ведамствамі і арганізацыямі, якія праводзяць фізкультуру, у сэнсе выкананьня гэтымі дырэктыў партыі і ўраду, не ўзгадаў на канкрэтныя формы недацэнкі фізкультурнага руху і скажэньня дырэктыў у гэтым напрамку шэрагам цэнтральных ведамстваў, чым у значнай ступені тлумачыцца зрыў кантрольных лічбаў. на 1931 год і прарывы ў падрыхтоўцы фізкультурных кадраў.

Апарат ВСФК не рэарганізаван па прынцыпу апэрацыйнасьці, што не дазволіла ВСФК забясьпечыць раённыя саветы фізычнай культуры і нізавыя фізкультарганізацыі сыстэматычным кіраўніцтвам і дапамогай у арганізацыі фізкультурнай работы на мясцох.

Раённыя выканаўчыя камітэты ў большасьці сваёй ня выканалі дырэктывы Прэзыдыуму ЦВК аб арганізацыі савету фізкультуры пры ўсіх РВК і ўзмацненьні іх работы, а тыя саветы на мясцох, якія ўжо існуюць яшчэ ня сталі сапраўднымі дзяржаўнымі органамі кіраўніцтва фізкультурнай работы.

3. Выходзячы з вышэйадзначанага, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

а) абавязаць Вышэйшы Савет Фізычнае Культуры ў месячны тэрмін праверыць і зацьвердзіць канкрэтныя пляны ў галіне фізкультуры ўсіх дзяржаўных, каапэрацыйных і грамадзкіх арганізацый (ЦКА, НКАховы Здароўя, НКПрацы, ВСНГ, Калгасцэнтр, ЦСПСБ і інш.) на 2-ю палову 1931 г. і на 1932 год, улічыўшы у іх неабходнасьць шырокага разгортваньня фізычнай культуры на прадпрыемствах, установах і ў сацыялістычным сэктары вёскі. Дабіцца ў працягу 1931 г. ахопу гуртковаі і масавай фізкультурнай работай рабочых саўгасаў і МТС, а таксама калгасьнікаў ня менш як 30 проц. у навучальных установах—на 100 проц.

Даручыць ВСФК разам з ЦСПСБ праз прафсаюзныя арганізацыі забясьпечыць ахоп масавай фізкультурай ня менш як 50 проц. членаў прафсаюзаў. Накіраваць усю фізкультурную работу на палепшаньне зьместу клясавага выхаваньня фізкультурных мас на грунце поўнага ўцягненьня апошніх у правядзімыя партыяй, савецкімі, прафсаюзнымі і грамадзкімі арганізацыямі мерапрыемствы палітычнага, гаспадарчага і культурнага характару (выкананьне прамфінпляну, калектывізацыя, арганізацыя працы ў калгасах, пераход на зьдзельшчыну, ліквідацыя няпісьменнасьці, выкананьне фінпляну, мабілізацыя сродкаў насельніцтва, уборачная кампанія, асеньняя сяўба і г. д.).

Разгортваньне фізкультурнай работы павінна праводзіцца пад пунктам погляду падрыхтоўкі фізкультурнікаў да працы і абароны з усямерным разьвіцьцём самадзейнасьці, добраахвотнасьці і шырокай пралетарскай крытыкі і самакрытыкі сярод фізкультурнікаў мабілізуючы іх на рашучую барацьбу са скрыўленьнем клясавай лініі ў фізкультурным руху;

б) у мэтах забесьпячэньня усе ўзрастаючага фізкультурнага руху ў БССР пралетарскімі кадрамі, даручыць ВСФК разам з НКАсьветы і ўсімі зацікаўленымі арганізацыямі ў месячны тэрмін распрацаваць сетку новых навучальных устаноў па фізкультуры і другіх форм па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы інструктароў фізкультуры на 1932 г. і падаць на разгляд Савету Народных Камісараў БССР.

в) Абавязаць Вышэйшы Савет Фізычнай Культуры і Дзяржплан БССР разам з усімі зацікаўленымі дзяржаўнымі і грамадзкімі арганізацыямі распрацаваць кантрольныя лічбы разьвіцьця фізкультурнага руху ў БССР і патрэбных спорт-пабудоў на 1932 год і падаць іх у СНК для ўключэньня ў агульны плян сацыялістычнага будаўніцтва БССР.

г) Прапанаваць усім гарадзкім саветам і раённым выканаўчым камітэтам неадкладна ўжыць адпаведныя захады да ўстанаўленьня сыстэматычнага кіраўніцтва і практычнай дапамогі раённым саветам фізкультуры, заслухоўваючы іх даклады аб дзейнасьці, і ўжываючы захады да пераўтварэньня іх у сапраўдныя дзяржаўныя органы фізкультурнага руху ў раёнах і гарадох. Неадкладна арганізаваць саветы фізкультуры там, дзе яны яшчэ не арганізаваны, стварыўшы нармальныя ўмовы для іх практычнай работы.

Раённым выканаўчым камітэтам выканаць дырэктыву Прэзыдыуму ЦВК ад 27-I—1930 г. аб забесьпячэньні адпаведнымі сродкамі будаўніцтва стадыёнаў, плящовак, спорт-саль і абсталяваньня фізкультурных саль, клюбаў, у школах, нардамох і рабочых посёлках.

Разам з гэтым даручыць ВСФК, ВСНГ і НКСнабу у месячны тэрмін распрацаваць пытаньне аб снабжэньні спорт-інвэнтаром і прыладамі фізкультурнага руху у БССР.

д) Абавязаць НК Аховы Здароўя ў месячны тэрмін распрацаваць плян навукова-дасьледчых работ па фізкультуры і плян 100 процэнтнага ахопу фізкультурнікаў доктарскім кантролем. Для работы ў галіне фізкультуры вылучыць адпаведныя доктарскія кадры і вызначыць сталыя базы навукова-практычнай працы (фізкультгабінэты, пункты карэгуючай гімнастыкі і г. д.).

е) Абавязаць НКАсьветы разгледзець пытаньне аб арганізацыі ў 1931—32 г. у пэдвузах і тэхнікумах спэцыяльных катэдраў па фізычнай культуры і аддзяленьня па падрыхтоўцы інструктароў фізкультуры, з таксама распрацаваць да пачатку 1932 году адзіную сыстэму фізкультурнага навучаньня ва ўсіх ступенях навучальнай сеткі.

4. Прапанаваць фізкультурным арганізацыям прыняць рашучыя захады да ўзмацненьня беларусізацыі і пераводу ўсёй гуртковаі і масавай фізкультурнай работы на беларускую мову і мову нацменшасьцяй, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на ўзмацненьне інтэрнацыянальна-клясавага выхаваньня фізкультурнікаў і мабілізацыі іх на рашучую барацьбу з скрыўленьнямі нацыянальнай палітыкі (нацабмяжаванасьцю, вялікадзяржаўным шавінізмам, як больш небясьпечным на даным этапе, зитысемітызмам і шавінізмамі розных колераў).

5. Даручыць Белдзяржвыдавецтву пры ўдзеле ВСФК да канца 1931 г. выдаць на беларускай мове і мовах нацменшасьцяй сэрыю брашур па фізкультуры і падручнікаў; а таксама ўключыць выданьне фізкультурнай літаратуры ў плян сваёй работы на 1931 г.

6. Даручыць Акадэміі Навук разам з ВСФК у 2-х месячны тэрмін распрацаваць фізкультурную тэрміналёгію на беларускай мове.

7. Прапанаваць Вышэйшаму Савету Фізычнай Культуры забясьпечыць плянавае кіраўніцтва дзейнасьцю ў галіне фізкультуры ўсіх цэнтральных ведамстваў і арганізацый і праз 3 месяцы далажыць Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР аб выкананьні гэтай пастановы.

Ч. в. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Гінлякевіч.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
В. Вансоўскі.

21 ліпеня 1931 г.
г. Менск.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР
пра забесьпячэньне апалам у 1931 г.

Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што тэмпы выкананьня Лесбелам і торфаарганізацыямі пляну дровазагатовак і торфадабычы не забясьпечваюць нармальнага снабжэньня апалам усіх груп спажыўцоў у БССР.

Улічваючы напружанае становішча з апалам і патрэбу поўнага і бесьперабойнага снабжэньня апалам асноўнай прамысловасьці і вялікіх гарадоў БССР, СНК БССР **пастанаўляе:**

1. Пакінуць на снабжэньні гатовымі дровамі ў парадку, прадугледжаным пастановамі Савету Працы і Абароны за 7 кастрычніка 1930 г. (З. З. СССР 1930 г., № 51, арт. 543) і Эканамічнае Нарады БССР за 28 лістапада 1930 г. ўсіх спажыўцоў прамыслова-тэхнічнай групы, дзяржаўныя, камунальныя, каапэрацыйныя і грамадзкія ўстановы і прадпрыемствы, а таксама і працоўнае насельніцтва ў гарадох: Менску, Віцебску, Гомлі, Магілеве, Бабруйску, Барысаве, Воршы і Рэчыцы.

Усе іншыя пункты забясьпечваюцца дрывамі праз арганізацыю спажыўцамі (прадпрыемствамі мясцовай прамысловасьці і саматужна-прамысловай каапэрацыі, раённымі ўстановамі, школамі, больницамі, саўгасамі і г. д.) самазагатовак звыш плянавых заданьняў для адпаведных раёнаў.

Органы Народнага Камісарыяту Шляхоў, ваенвед і прамысловыя прадпрыемствы саюзнага і рэспубліканскага значэньня незалежна ад месца іх знаходжаньня, а таксама ўсе іншыя прадпрыемствы, якія знаходзяцца на адлегласьці больш 30 кілёмэтраў ад лясных масываў, забясьпечваюцца гатовымі дрывамі.

2. Самазагатоўкі дроў праводзяцца адпаведнымі арганізацыямі, установамі і прадпрыемствамі пад беспасрэднай кіраўніцтвам Лесбелу.

3. Прапанаваць Лесбелу разам з раённымі выканаўчымі камітэтамі для забясьпечаньня спажыўцоў, якія павінны перайсьці на самазагатоўкі, зараз-жа вызначыць адпаведныя дзялянкі, выходзячы з норм патрэбнасьці ў дровах, зацьверджаных раённымі плянавымі камісіямі.

4. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Снабжэньня, Белкамсаюзу і Лесбелу забясьпечваць рабочых, занятых на самазагатоўках дроў хлебафуражом і прамысловымі тавамі з агульных фондаў, адпушчаных на дровазагатоўкі.

5. Прапанаваць рёанным выканаўчым камітэтам зьвярнуць асаблівую ўвагу ўсіх спажыўцоў апалу на неабходнасьць максымальнага пераходу на торфавы апал, эканоміі апалу і поўнага скарыстаньня лясных адыходаў і валежу, катэгарычна забараняючы зьнішчэньне іх, а таксама забараняючы адвод лесасек там, дзе ёсьць магчымасьць перайсьці на торфавы апал альбо скарыстаць адыходы і валеж.

6. Прапанаваць гарадзкім саветам па казаных у арт. I гарадоў разам з Лесбелам і Белторфам прымаваць буйныя прамысловыя прадпрыемствы да паасобных леспрамгасаў і торфараспрацовак.

Абавязаць гарадзкія саветы разгарнуць шырокую растлумачальную работу для ўцягненьня рабочых і ўсіх працоўных у змаганьне за апал і кантроль за снабжэньнем апалам праз арганізацыю брыгад і дружын для пасылкі ў лес, прыняцьце шэфства над асобнымі леспрамгасамі і торфараспрацоўкамі і ўдзел у палепшаньні культурна-масавай работы на дровазагатоўках.

7. Абавязаць Лесбел і Белкалгасцэнтр забясьпечыць поўнае выкананьне заключанага паміж імі дагавору аб накіраваньні на лесазагатоўкі 10.000 рабочых і 20.000 падвод.

8. Катэгарычна забараніць раённым выканаўчым камітэтам і гаспадарчым арганізацыям забіраць і перакідваць у іншыя месцы апал з тых прадпрыемстваў, якія ўжо загатовілі і падвезьлі яго ў колькасьці, якая не перавышае іх патрэбы.

9. Улічваючы, што загатоўка дроў будзе праводзіцца доўгацём, даручыць мэханічную распрацоўку дроў на чыгуначных станцыях, складах і прадпрыемствах.

10. Адзначаючы недапушчальна нізкі процант выкананьня плянаў торфаздабычы па лініі саматужна-прамысловай каапэрацыі, абавязаць Белсамтрам саюз неадкладна дабіцца пералому ў ходзе торфаздабычы і забясьпечыць поўнае выкананьне пляну.

11. Прапанаваць Лесбелу неадкладна пачаць дастаўку дроў у Менск і выдачу іх рабочым гораду ў лік зімовай нормы.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР
К. Бэнэк.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР
С. Кандыбовіч.

28 ліпеня 1931 г. гор. Менск.

(Выраж для памяці)

Зацьверджана праўленьнем Х. Ц. БССР 19-VII арат. № 16-24.

Брыгада—асноўнае зьвяно ў калгасе
ПАЛАЖЭНЬНЕ
аб рабоце брыгадзіра і парадку ацэнкі яго працы

1. Брыгада зьяўляецца асноўным апэрацыйным зьвяном у калгасе, кіраўнік брыгады—брыгадзір — цэнтральная фігура калгаснай вытворчасьці. Брыгадзір непасрэдна арганізуе работу калгасьнікаў у брыгадзе і праводзіць у жыцьцё ўсе мерапрыемствы, вызначаныя вытворчым пляном калгасу.

2. Брыгадзір назначаецца праўленьнем калгасу з найбольш вопытных і актыўных калгасьнікаў і калгасьніц-ударнікаў з ліку батракоў, беднякоў і лепшых адданых справе калектывізацыі серадняковаў, якія зьяўляюцца перадавымі па ўжываньні сацыялістычных форм працы (сацспаборніцтва і ўдарніцтва). Зьняцьце брыгадзіра з працы праводзіцца праўленьнем толькі пасьля падрабязнага высьвятленьня яго непрацездольнасьці кіраваць брыгадай.

3. Брыгадзір адказвае асабіста за работу ўсёй брыгады, атрымлівае заданьне (нарад), назначае адказных за выкананьне кожнай работы ў брыгадзе, асоб, кантралюе выкананьне калгасьнікамі даручанай ім работы, робіць ацэнку і вядзе вучот колькасьці і якасьці выкананьня работы кожным калгасьнікам.

4. Як правіла, брыгадзір павінен атрымаць нарад на надыходзячыя работы загадзя перад пачаткам гэтых работ: інфармуе калгасьнікаў і прапрацоўвае разам з імі атрыманае заданьне.

5. Брыгадзір штодзенна інфармуе праўленьне альбо кіраўніка галіны гаспадаркі аб ходзе выкананьня даручанай яго брыгадзе працы і вядзе шырокую масавую работу па ўкараненьні ў брыгадзе форм сацыялістычнай працы, забясьпечвае своечасовае выкананьне і перавыкананьне даручаных брыгадзе заданьняў.

6. Для пасьпяховага правядзеньня вучоту працы калгасьнікаў у больш буйных брыгадах у дапамогу брыгадзірам вылучаецца са складу калгасьнікаў спэцыяльная асоба—вучотчык, які пад кіраўніцтвам брыгадзіра праводзіць абмер плошчаў мясц работы альбо падлік выпрацаванай брыгадай на кожны дзень прадукцыі і робіць налічэньне калгасьнікам працадзён за зробленую працу. Запісы працадзён у працоўных кніжках калгасьнікаў абавязкова праводзяцца за подпісамі брыгадзіра.

7. Брыгадзір асабіста прымае работу ад калгасьнікаў і робіць яе ацэнку. ён асабіста мае права зьніжаць працадні калгасьнікам за дрэнную якасьць работы альбо за парушэньні імі працдысцыпліны, нядбайныя адносіны да інвэнтара, цягавай сілы і г. д. у межах, вызначаных праўленьнем і агульным сходам калгасу. Лепшых калгасьнікаў ён прадстаўляе праўленьню для прэміраваньня.

8. Брыгадзір абавязкова ўдзельнічае ў агульных вытворчых нарадах калгасу, кіруе вытворчай нарадай па брыгадзе і сыстэматычна інфармуе праўленьне і вытворчую нараду аб становішчы працдысцыпліны, выпрацоўцы калгасьнікаў і ўсіх недахопах, якія перашкаджаюць правільнай арганізацыі працы ў брыгадзе.

9. Ацэнка работы брыгадзіра павінна праводзіцца выключна выходзячы з колькасьці і якасьці выкананай працы ўсёй брыгадай. Брыгадзір, як правіла, павінен удзельнічаць у рабоце сумесна з брыгадай, за выключэньнем тых выпадкаў, калі брыгадзір вызвален ад фізычнай працы пастановай праўленьня калгасу. Брыгадзір можа быць вызвален ад фізычнай працы толькі ў тым выпадку, калі брыгада вялікая. За кіраўніцтва брыгадай і дадатковую работу (абмену, вучоту работы, уліку працы і запісу працадзён) брыгадзіру налічваецца дадатковa да выпрацаваных ім працадзён 15 сотак пры колькасным складзе брыгады да 25 асоб і 25 сотак звыш 25 асоб.

Калі брыгада сыстэматычна ня выконвае норм выпрацоўкі, дрэнна працуе і г. д., праўленьне калгасу пазбаўляе брыгадзіра ўстанаўленых надбавак.

10. За сыстэматычнае перавыкананьне норм брыгадай і датэрміновае выкананьне нарадаў брыгадзір павінен прэміравацца асобнымі працаднямі альбо грашыма і натурай. Прэміі брыгадзіру вызначае праўленьне калгасу на падставе высьветленых дасягненьняў у рабоце брыгады.

11. Калгасы і калгассаюзы павінны весьці спэцыяльны вучот складу брыгадзіраў, сыстэматычна вылучаць на больш адказную працу як у калгасах, так і ў нізавых зьвяньнях савецка-каапэрацыйнага парадку.

12. Брыгадзір на працягу поўнага пэрыяду павінен прайсьці адпаведныя кароткa-тэрміновыя курсы па пытаньнях калгаснага будаўніцтва і атрымліваць а дпраўленьня калгасу і калгассаюзу сыстэматычнае інструктаваньне, дапамогу і належнае падтрыманьне ў выкананьні даручанай яму адказьнейшай задачы.

Нам. Старшыні Праўленьня
Калгасцэнтру БССР **Стрэле.**

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

Мендзяржтэатр	Апошнія дні гастроляў опэры пад кіраўніцтвам Я. Е. Воўкава 1. ПАЯЦЫ муз. Леонкавала 2. Балетны дывэртысмэнт Пачатак а 8 гадз. Білеты ў раб. касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.
Дзяржцырк	Гастролі нямецкага ўкраіцеля ЛАЦІ з яго групай бэрбэрыйскіх ЛЬВОЎ Паветраны палёт Вале ціні 2 Сазановы 2 — з першом — / Тік—Так акробаты эксцэнтрыкі Пачатак а 8 гадз. 45 хв. увечары. Льготныя білеты ў рабкасе
КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРЫ	З 27-га ліпеня новы фільм Станцыя Пупкі пачатак а 7 гадзіне
Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"	Ад 21 ліпеня М. Ю. Лермантаў на экране (Герой нашага часу) КНЯЖНА МЭРЫ Пачатак а 7 гадзіне. Каса а 5 гадз.
КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"	2 серыі 18 частак у адзін сэанс Стэнлей у нетрах Афрыкі Пачатак а 2, 3-45, Вяч. а 7, 8-45 і 10-30 г.
„Чырвоная Зорка"	ПЕРШЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ = ПУЦЕУКА У ЖЫЦЬЦЁ = Драма ў 34 эпізодах

Радыёцэнтрам у Маскве 31 ліпеня г. г. а 8 гадз. увеч.
ПРАВОДЗІЦЦА
РАДЫЁПЕРАКЛІЧКА ДВУХ АБЛАСЬЦЕЙ,
ЯКІЯ СПАБОРНІЧАЮЦЬ ПАМІЖ САБОЙ—ЛЕНІНГРАДЗКАЙ І ЗАХОДНЯЙ
У аснове перакліччі ляжыць праверка гатоўнасьці да ўборкі лёну і канапель Райза, Калгассаюзам прапануецца апавясьціць аб гэтым шырокія масы калгасьнікаў рабочых саўгасаў, а таксама аднаасобнікаў па лініі с.-с.
НАРКАМЗЕМ БССР

Загадам Дзяржаўнага ўсесаюзнага аб'яднаньня лясной гаспадаркі і дрэвапрацоўваючых прадпрыемстваў на транспарце — ВАЛТ—НКШЗ, з 15 ліпеня 1931 г. утворан Транспартны Лясны Трэст
Беларусі і Заходняй вобласьці
„БЕЛТРАНСЛЕС"
ЯКІ АБ'ЯДНАЎ НАСТУПНЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ:
б. Паўночна - Беларускага раённага лясного кіраўніцтва НКШЗ — „СЕВБЕЛТРАНСЛЕС", размешчаных у межах БССР і Заходняй вобласьці: 1. Менскі, Невельскі і Калінкавіцкі лесазагатоўчыя раёны. 2. Барысаўскі, Азарыцкі, Смаленскі, Жалезьніцкі, Велясоўскі, Гарадоцкі, Какарэўскі 1-шы, Какарэўскі 2-гі, Холмецкі, Краснаборскі і імя Войкава—лесапільныя заводы.
Месца знаходжэньня дырэкцыі—гор. Менск.
Часовы паштовы адрас—Менск—таварная.
Умоўны адрас для тэлеграм—Менск--БЕЛТРАНСЛЕС
ДЫРЭКЦЫЯ.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ
ва Усебеларускі Палітыка-Асьветны Інстытут на 1931-32 г.

Палітыка-Асьветны Інстытут мае мэту падрыхтаваць палітасьветных працаўнікоў з вышэйшай кваліфікацыяй па асобных галінах палітасьветнай працы

У адпаведнасьці з гэтым пры інстытуце існуюць спэцыяльныя аддзяленьні:
1. Арганізацыйна-інструктарскае, 2. Бібліятэчнае, 3. Масавай палітыка-асьветнай працы

На першы курс без іспытаў прымаюцца асобы, скончыўшыя курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ і ВТНУ, тэхнікумы, 9-гіодкі, ФЗВ і іншыя раўпалежныя ім навучальныя ўстановы.

Усе іншыя павінны трымаць іспыты ў абёме ведаў сярэдняй школы.

У палітыка-асьветны інстытут на аддзяленьні—арганізацыйна-інструктарскае і масавай палітыка-асьветнай работы прымаюцца партыйцы і камсамольцы, якія маюць ня менш як двухгадовы стаж актыўнай партыйнай, комсамольскай або грамадзкай працы.

На бібліятэчнае аддзяленьне прымаюцца і беспартыйныя з двухгадовым стажам грамадзкай працы.

Узрост паступаючых ад 17—35 год.

У інстытут ня прымаюцца асобы з заразнымі хваробамі, хворыя нэўрастэніяй у клінічнай форме, сухотамі і зусім фізычна слабыя.

Паступаючыя ў палітыка-асьветны інстытут павінны падаць на імя раённых і гарадзкіх камісій, што існуюць пры райкомах і гаркомах КП(б)Б заяву з паказаньнем аддзяленьня і далучыць наступныя дакументы:

I. Аб узросьце, 2. Аб адносінах да вайсковай павінасьці (адбітак), 3. Аб адукацыі, 4. Аб стане здароў'я, 5. Аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў, 6. Для калгасьнікаў—даведку ад калгасу, а для аднаасобнікаў—адпаведны дакумант аб сел.-гасп. падатку на 1931 г., 7. Даведку аб 2-хгадовым практычным стажы (для асоб, якія скончылі тэхнікум і прафшколу), 8. Характарыстыку мясцовай, партыйнай або камсамольскай ячэйкі, 9. Анкету засьведчаную савецкімі або праф. установамі і арганізацыямі раённага маштабу, 10. Дзьве фотакарткі і на 30 кап. марак для адказу.

Дакумэнты аб асьвеце дасылаюцца толькі ў арыгінале; форма анкеты тая-ж як і для ўсіх вышэйшых навучальных устаноў.

Праца адборачных камісій пры райкомах і гаркомах павінна быць скончана да 1-га верасьня.

Сьпісы камандыруемых з усімі дакумантамі дасылаюцца райкомамі і гаркомамі КП(б)Б палітыка-асьветнаму інстытуту не пазьней чым да 10-га верасьня па адрасу: гор. Магілеў (на Дняпры, Камсамольская, 28).

З 10—25 верасьня праводзяцца іспыты.

Усе залічаныя студэнты інстытуту забясьпечваюцца інтэрнатам, стыпэндыяй, пасьцельнай бялізнай, падручнікамі і пісьмовымі прыладамі.

Інстытут не бярэ на сябе ніякіх абавязацельстваў па прадстаўленьні кватэр сем'ям студэнтаў.

Для канчатковага залічэньня студэнтаў пры інстытуце ўтвараецца камісія.

Прыём на 1-шы курс інстытуту ўстанаўляецца ў 60 асоб.

Райкомы і Гаркомы КП(б)Б камандыруюць звыш нормы для адбору: Менскі, Віцебскі, Гомельскі ня менш як па 4 чал., Магілеўскі, Полацкі, Шклоўскі, Рэчыцкі, Бабруйскі, Жлобінскі ня менш, як па 3 чал., а ўсе астатнія раёны ня менш, як па 2 чал.

Заняткі на 1-ым курсе інстытуту пачнуцца 1-га кастрычніка

Студэнты 2 курсу ін-ту (б. палітасьветнае аддз. БДУ) павінны зьявіцца на заняткі да 15 верасьня

Дырэктар КАПАЕВІЧ

Пастанова Народнага Камісарыяту Працы БССР
23 чэрвеня 1931 г. № 33 Гор. Менск

Пра зварот на работу па спэцыяльнасьці асоб, скончыўшых палітасьветныя тэхнікумы і спэцыяльныя курсы па палітасьветрабоце".

У выкананьне пастановы СНК БССР ад 12-га мая 1931 г. (З.З. БССР № 18 арт. 154)
НАРКАМПРАЦЫ БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зьвярнуць на работу ў палітасьветныя ўстановы ўсіх асоб, якія скончылі палітыка-асьветныя тэхнікумы і спэцыяльныя цэнтральныя, акруговыя, раённыя і гарадзкія курсы паліт. асьвет. работнікаў у 1930 г., і якія знаходзяцца на працы ў іншых гаспадарчых, савецкіх і грамадзкіх установах і арганізацыях.

УВАГА: Звароту не падлягаюць тыя з палітасьветработнікаў, якія ў сучасны моманг знаходзяцца на выборчых адказных пасадах.

2. Абавязаць усіх кіраўнікоў гаспадарчых, савецкіх, прафесійных, каапэрацыйных і грамадзкіх устаноў і арганізацый да 30-VII 1931 г. прадставіць раённым і гарадзкім інспэктарам працы імянныя сьпісы асоб, што падлягаюць звароту ў палітасьветныя ўстановы з паказаньнем, якую скончыў навучальную ўстанову і займаемую пасаду.

3. Прапанаваць усім гаррайінспэктарам працы не пазьней 5-га жніўня г. г. сумесна з райінспэктарам Наркамасьветы і прадстаўніком саюзу працасьветы разглядзець усе сьпісы і наменіць пэрсанальна асоб, якія падлягаюць звароту ў палітасьветныя ўстановы.

4. Адкамандыраваньне работнікаў робіцца па кожным выпадку паасобку па запатрабаваньні райінспэктара палітасьветы, які і прызначае пераводзімага работніка на палітасьветную работу.

Па атрыманьні паведамленьня ад райінспэктара палітасьветы—адміністрацыя ўстановы, у якой працуе паліт. асьвет. работнік, павінна аслабаніць яго ад займаемай пасады на працягу 5 дзён.

5. Работнікі, якія зьвернуты на работу ў палітасьветную ўстанову, паводле гэтай пастановы карыстаюцца ільготамі, прадугледжанымі пастановай СНК СССР за 18-VI-1931 г. „Пра ільготы для работнікаў, пераводзімых па распараджэньню органаў працы". (Изв. ЦИК и ВЦИК за 22-е чэрвеня 1931 г.).

6. Кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў за несвоечасовае прадстаўленьне сьпісаў і неадкамандыраваньне палітасьветработнікаў, а таксама работнікі, якія ўхіляюцца ад пераходу на работу ў палітасьветныя ўстановы прыцягваюцца да адказнасьці.

ПІІ. Народны Камісар Працы БССР БАСКІН

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА
СЭКТАР КНІГАРАСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ

Да міжнароднага чырвонага дню (1-га жніўня)

Далоў вайну імпэрыялістаў супроць СССР (зборнік). Цана 20 кап.
МАКСІМ ГОРКІ і РОМЭН РОЛЯН выкрываюць інтэрвэнтаў Цана 10 кап.
САМАХВАЛАЎ—1-га Жніўня. Цана 7 кап.
ПАЭГЛЕ—Змаганьне работніц капіталістычных краін супроць вайны. Цана 20 кап.
БАГЕН—Заходняя Беларусь пад крывавым бізуном польскіх акупантаў. Цана 10 кап.
ДЗІКЕН—Як жывецца пролетарыяту ў Англіі Цана 7 кап.
ДАНІШЭЎСКІ—Жыцьцё і барацьба Польскага пролетарыяту. Цана 10 кап.
НІКОЛЕЦЬЦІ—Італьянскі пралетарыят пад уладаю фашыцкай дыктатуры. Цана 7 кап.
ІОЗЭФ—Рэволюцыйны ўздым Вэнгрыі. Цана 20 кап.
РАБОТЭ—Барацьба францускіх рабочых. Цана 14 кап.
ХАЯМА—Рабочы рух у калёніях Усходу. Цана 50 кап.
РУБІНШТЭЙН—Сусьветны эканамічны крызіс капіталізму. Цана 85 кап.
БУДЗІН—Контррэволюцыйны меншавізм на службе інтэрвэнцыі. Цана 70 кап.
КАШЭН—Францускі імпэрыялізм рыхтуе вайну супроць СССР. Цана 10 кап.
ПЯСТУН—У нас і ў іх. Цана 10 кап.
ЛЯСКОЎ—Буржуазія на фашыцкім шляху. Цана 12 кап.
ДЗЯТРЫХ—Сусьветнае беспрацоўе. Цана 9 кап.
ГАЕК—Жыцьцё і барацьба чэха-славацкіх рабочых Цана. 10 кап.

Прадаюцца ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва, Спажыўкаапэрацыі і Саюздруку.

Менскі Архітэктурна-Будаўнічы і Дарожна-Будаўнічы Тэхнікум (былы Палітэхнікум)
ПРАЦЯГВАЮЦЬ ПРЫЁМ ЗАЯЎ
ад жадаючых паступіць у лік студэнтаў па 20 жніўня 1931 году.
Заявы з анкетай і дакумантамі, згодна ўмоў прыёму (даведнік НКАсьветы БССР) накіроўваць па адрасу: Менск, Карла Маркса, 37).
Дырэктар Тэхнікумаў АНАДЗІН.

БЕЛЛЁНАСАЮЗ АБ'ЯЎЛЯЕ,
штo ў сувязі з ліквідацыяй раёнаў
ЛІКВІДУЮЦЦА
наступныя 13 райкаапсаюзаў лёнаводнай с.-гаспад. каапэрацыі:

1. Боркавіцкі.
2. Ветрынскі.
3. Вульскі.
4. Межанскі.
5. Высачанскі.
6. Багушэўскі.
7. Чарэйскі.
8. Халопенінскі.
9. Лявонінскі.
10. Коханаўскі.
11. Кругляскі.
12. Копыскі.
13. Хоцімскі.

Усе прэтэнзіі, якія маюцца да памянёных райкаапсаюзаў, павінны быць прадстаўлены ліквідкамісіям адпаведных саюзаў, па месцы ранейшага знаходжаньня ліквідуемага саюзу, не пазьней 5 жніўня г.г.
БЕЛЛЁНАСАЮЗ.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў,—6-15. Выдавецтва—2-44.
падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., на год—12 руб.

Глаўлітбел № 598

Друкарня імя СТАЛІНА